Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

4 ЛІПЕНЯ 2015 г. СУБОТА № 125 (27983) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

СВЯТА, ЯКОЕ ЗАЎСЁДЫ З НАМІ

Учора ўся краіна адзначала галоўнае дзяржаўнае свята — Дзень Незалежнасці. Свята жыцця, свята ўпэўненасці ў заўтрашнім дні, свята памяці аб тых ахвярах, дзякуючы якім Беларусь атрымала сваю незалежнасць і права на існаванне.

Афіцыйныя мерапрыемствы прайшлі ў сталіцы. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўсклаў вянок да манумента Перамогі. Удзел ва ўрачыстай цырымоніі прынялі найвышэйшыя службовыя асобы, кіраўнікі дзяржорганаў, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый, ветэраны, свяшчэннаслужыцелі, дыпламаты. Яны таксама ўсклалі да падножжа манумента кветкі і вянкі.

Прысутныя на плошчы Перамогі ўшанавалі хвілінай маўчання памяць загінулых. У цішыні прагучала 20 удараў метранома. Пасля выканання Дзяржаўнага гімна па плошчы ўрачыстым маршам прайшла зводная рота і аркестр ганаровай варты камендатуры Узброеных Сіл.

Аляксандр Лукашэнка пагутарыў з кіраўнікамі дыпламатычных місій, цёпла прывітаў ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. «Наш дагавор вы помніце: як мага даўжэй жыць. Вы нам вельмі патрэбны», — сказаў кіраўнік дзяржавы, звяртаючыся да ветэранаў. Ён пажадаў ім здароўя і шчасця і падзякаваў за падтрымку.

А прыгожыя мінскія вуліцы віравалі тысячамі людзей. Карэспандэнты «Звязды» таксама апынуліся ў святочным віры, каб разам з усімі адчуць усю веліч і святло гэтага вялікага ліпеньскага дня, калі 71 год таму быў вызвалены Мінск.

Нягледзячы на тое, што на гэты раз парад не планаваўся, добра правесці час можна было ў любым раёне сталіцы. Арганізатары, як кажуць, пастараліся... А эпіцэнтрам свята, па традыцыі, стала пляцоўка каля Палаца спорту. Канцэртная праграма «Ганаруся табой, Беларусь!» радавала мінчан і гасцей горада з раніцы да вечара. Тут жа прысутныя маглі не толькі павесяліцца, а і падсілкавацца. Якіх толькі страў не прапаноўвалі гандляры! Акрамя таго, на выстаўцы-кірмашы можна было набыць розныя ўпрыгажэнні, кухонныя прылады, вопратку — амаль усё зроблена сваімі рукамі.

Маленькай Марце, напрыклад, бабуля Алена купіла саламяны кошык. З падарункам дзяўчынка не расставалася на працягу дня. Відаць было: усё, што адбывалася навокал, ёй прыйшлося вельмі даспадобы.

— Дзень Незалежнасці — найгалоўнейшае свята ў нашай краіне, — пераканана мінчанка Вольга Рыжова. — Наш народ сам выбірае, якой дарогай ісці, мы можам жыць так, як лічым патрэбным, не падпарадкоўваючыся чыімсьці ўказанням. У нашай краіне створаны ўсе ўмовы для добрага жыцця: мы маем магчымасць працаваць, вучыцца, гадаваць дзяцей, годна праводзіць старасць. А што яшчэ трэба?

Жанчыне, як нікому, вядома, што можа быць і па-іншаму. Не вярнуліся з вайны два дзядзькі Вольгі Мікалаеўны — прапалі без вестак. Гітлераўцы застрэлілі бабулю. Бацька-франтавік не раз расказваў дачцэ, якой цаной была здабыта Перамога. Нягледзячы на цяжкае раненне (асколак у шыі застаўся на ўсё жыццё), Мікалай дайшоў да Берліна. Быў узнагароджаны медалямі «За адвагу», «За ўзяцце Берліна», «За ўзяцце Кёнігсберга».

Да германскай сталіцы дайшоў і дзядуля Максіма Шпетнага. Будучы ўрач лічыць, што менавіта дзякуючы ветэранам мы сёння маем магчымасць не толькі святкаваць гэты дзень, але і ўвогуле жыць на свеце. «Мне здаецца, што Вялікая Айчынная вайна стала якраз тым пераломным момантам, калі мы павінны былі стаць або рабамі, або грамадзянамі незалежнай краіны, — гаворыць юнак. — Дзякуючы вытрымцы і мужнасці нашага народа мы перамаглі і сталі незалежнымі».

Часова стаць акцёрам можна было на пляцоўцы каля Палаца культуры і спорту чыгуначнікаў. Атрымаць асалоду ад прахалоды ў гэты спякотны дзень удалося на бульвары імя Уладзіміра Мулявіна. Тут, у цені дрэў, адбыўся святочны канцэрт. Эпіцэнтрамі дзіцячай весялосці сталі паркі сталіцы.

Мінск.

А галоўным героем (для мяне дакладна) — маленькі Іван Анішчук. На святочныя вуліцы горада чатырохгадовы хлопчык выехаў на ўласным аўтамабілі. Ды яшчэ якім! У салдацкай форме Ваня рассякаў на амерыканскім «Вілісе», што ў гады Вялікай Айчыннай вайны пастаўляліся ў Савецкі Саюз.

Такі падарунак хлопчыку зрабіў бацька. І самае цікавае, што цацачны аўтамабіль Андрэй Анішчук зрабіў сваімі рукамі. «Мінулым летам мы з сынам вырашылі стварыць такі праект, — расказвае малады бацька. — Купілі ўсё неабходнае — калёсы, камплектуючыя, прыдумалі праект і за два месяцы сабралі аўтамабіль. Гэта мае дзіцячыя мары. Я заўсёды хацеў, каб у мяне была машына. Яна ёсць у майго сына — і мае мары ўвасобіліся толькі зараз».

— Глядзіце, якія тут ёсць прыборы: ключык, ліхтарык, пераключальнік. Калі назад уключаеш, то яно пікае, — знаёміць з устройствам аўтамабіля маленькі кіроўца. — Ехаць зусім не складана: проста націскаеш — і машына паехала. Упершыню я катаўся ў вёсцы. Усе як запхнуліся ў гэты джып, дык цяжка было везці. Восем чалавек!

Салдацкую форму часоў Вялікай Айчыннай вайны для Вані пашыла бабуля. Адзін у адзін: і рэмень, і боты, і галіфэ, і нават фуражка. Праўда, памер адпаведны — не на салдата. У маленькага кіроўцы ў той дзень ад сяброў не было адбою. Адны хацелі з ім проста сфатаграфавацца, іншыя пакатацца, а былі і такія, што прасіліся за руль.

Адным словам, усім — ад малога да вялікага — было чым заняцца. Увечары мінчане і госці сталіцы сабраліся на гала-канцэрце «Мы беларусы — мірныя людзі», які адбыўся каля стэлы «Мінск — горад-герой». У адзінаццаць мерапрыемства ненадоўга перарвалася — беларусы ў адзін голас спявалі гімн. Святыя для нас радкі агучвалі не толькі мінчане і госці сталіцы, якія сабраліся на адным з цэнтральных праспектаў горада. Гімн спявалі ва ўсіх абласных і раённых цэнтрах краіны — ва ўсіх куточках Беларусі! Пасля, ужо на змярканні, неба расквеціў святочны салют. Ён быў незвычайна прыгожым, як і тое свята, што нам пашчасціла адзначаць, што заўсёды з намі, як наша памяць і ўдзячнасць.

Вераніка КАНЮТА.
kanyuta@zviazda.by

Фота БЕЛТА і Надзеі БУЖАН.

Буйніцкае поле.

Брэсцкая крэпасць.

Віцебск.

ВІНШАВАННІ — З УСЯГО СВЕТУ

У адрас Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі і беларускага народа паступаюць шматлікія віншаванні ад кіраўнікоў замежных дзяржаў, міжнародных арганізацый, замежных палітычных, рэлігійных і грамадскіх дзеячаў з нагоды Дня Незалежнасці Беларусі, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Аляксандра Лукашэнку павіншавалі лідары краін СНД, Старшыня Кітайскай Народнай Рэспублікі, Старшыня Дзяржаўнага Савета і Савета Міністраў Рэспублікі Куба, Каралева Злучанага Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі, Кароль Швецыі, Імператар Японіі, прэзідэнты В'етнама, Егіпта, Індыі, Інданезіі, Ірландыі, М'янмы, Палесціны, Рэспублікі Карэя, Сербіі, Сінгапура, Швейцарыі, Шры-Ланкі.

Беларускага лідара павіншавалі таксама Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Кірыл, Князь і Вялікі Магістр Суверэннага Ваеннага Ордэна Гаспітальераў Святога Іаана Іерусалімскага, Радоса і Мальты, генеральны сакратар Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

«Дзяржаўнае свята Рэспублікі Беларусь, што адзначаецца ў дзень вызвалення краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, нясе ў сабе памяць аб Вялікай Перамозе, якую сем дзесяцігоддзяў таму разам атрымалі нашы народы, — гаворыцца ў віншаванні Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Уладзіміра Пуціна. — Грунтуючыся на трывалых традыцыях дружбы і ўзаемавыручкі, расійска-беларускія адносіны прадаўжаюць дынамічна развівацца. Добрую аддачу дае двухбаковае супрацоўніцтва ў розных галінах, інтэграцыйнае ўзаемадзеянне ў рамках Саюзнай дзяржавы, а таксама Еўразійскага эканамічнага саюза. Упэўнены, што сумеснымі намаганнямі мы забяспечым далейшае нарошчванне ўсяго комплексу партнёрскіх сувязяў паміж Расіяй і Беларуссю».

Старшыня КНР Сі Цзіньпін у віншавальным пасланні адзначыў, што для супрацоўніцтва Беларусі і Кітая ў розных сферах адкрываюцца новыя перспектывы, і выказаў гатоўнасць да вывядзення кітайска-беларускіх адносін на новы ўзровень на карысць абедзвюх дзяржаў і народаў.

ISSN 1990 - 763X

ПЫТАННІ, ЯКІЯ НЕЛЬГА ПРАПУСЦІЦЬ

Прэзідэнт патрабуе ад урада і ўсёй вертыкалі ўлады безумоўнага выканання ўсіх яго даручэнняў эканамічнага характару

Такую задачу Аляксандр Лукашэнка паставіў на нарадзе па палітычных пытаннях, паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

«Мы часта праводзім нарады ў Прэзідэнта па эканамічных праблемах. Сапраўды, эканоміка для нас з'яўляецца найважнейшым пытаннем, асабліва ў гэтыя вострыя палітычныя моманты. Але ёсць і шэраг палітычных пытанняў, якія звязаны з бяспекай нашай краіны, знешняй палітыкай, асабліва яе змяненнем, з нашай арыентацыяй па экспарце на краіны Афрыкі, Усходу, іншыя дзяржавы», — сказаў беларускі лідар.

«Таму сёння я хацеў бы надаць увагу разгляду менавіта палітычных пытанняў, якія для нас актуальныя, на якія мы павінны адрэагаваць і ні ў якім выпадку не прапусціць іх. Гэтыя пытанні накіраваны сваім вастрыём не толькі ў знешнюю палітыку, але і ва ўнутрыпалітычную сітуацыю ў нашай краіне, сацыяльна-палітычную. Я хацеў бы, каб мы менавіта з гэтай пазіцыі разгледзелі ўсе тыя праблемы, якія сёння ёсць, на якія трэба рэагаваць і ні ў якім разе нельга выпускаць з-пад увагі», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнту даложана пра вынікі ўдзелу беларускага боку ў шэрагу мерапрыемстваў міжнароднага характару, аб сітуацыі, што ўзнікае вакол Беларусі, пра актуальныя падыходы краіны да шэрагу пытанняў міжнароднага парадку дня, а таксама аб стане і перспектывах адносін з вядучымі геапалітычнымі дзяржавамі і іншымі партнёрамі Беларусі.

Асаблівая ўвага была нададзена пытанням дыверсіфікацыі гандлёва-эканамічных адносін. Прэзідэнт выказаў крайняе незадавальненне тым, што рост тавараабароту назіраецца толькі з асобнымі краінамі, і запатрабаваў больш актыўна працаваць на іншых рынках. Кіраўнік дзяржавы лічыць неабходным узмацніць патрабаванне з адпаведных службовых асоб, адказных за развіццё супрацоўніцтва з асобнымі краінамі і рэгіёнамі.

Прэзідэнт праінфармаваны аб тым, што пасля прыняцця парламентам рашэння аб даце правядзення выбараў МЗС накіравала запрашэнні міжнародным наглядальнікам для ажыццяўлення назірання за выбарамі.

Кіраўніку дзяржавы таксама даложана інфармацыя пра сітуацыю ў рэгіёнах Беларусі, на асобных прадпрыемствах, аб настроях у працоўных калектывах. Прэзідэнт запатрабаваў не дапускаць ні ў якім разе расхлябанасці і самазаспакоенасці на месцах і звярнуў увагу ўрада і ўсёй вертыкалі ўлады на неабходнасць безумоўнага выканання ўсіх яго даручэнняў эканамічнага характару.

ЁСЦЬ КУДЫ РАСЦІ

Наша краіна гатова развіваць супрацоўніцтва з Катарам па любых напрамках. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з дзяржаўным міністрам па пытаннях абароны Катара Хамадам Бен Алі Аль-Атыя.

Кіраўнік беларускай дзяржавы адзначыў, што ў дзвюх краін намечана супрацоўніцтва па розных напрамках. «Забароненых тэм няма. Мы гатовы супрацоўнічаць ад адукацыі да ваенна-тэхнічнай сферы, калі на гэта будзе жаданне вашай краіны», — сказаў беларускі лідар.

Прэзідэнт лічыць сённяшні ўзровень тавараабароту паміж дзвюма краінамі ў памеры $18-20 млн смешным. «Мы разлічваем, што не проста падвоім, а на парадак павялічым гэты тавараабарот», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў катарскаму боку за інвесціраванне. Ён звярнуў увагу на рэалізацыю Інвестыцыйным фондам Узброеных сіл Катара праекта па будаўніцтве ў Мінску шматфункцыянальнага гасцінічна-спартыўнага комплексу. На думку Прэзідэнта, з'яўленне ў Мінску грамадзян Катара будзе садзейнічаць павышэнню сэрвісу ў гасцінічнай справе, рэстаранным бізнесе. «Але самае галоўнае — не толькі турысты, але і спецыялісты, палітыкі і асабліва бізнесмены будуць мець тут, у Мінску, свой дом, яны часцей сюды будуць прыязджаць. Думаю, мы адкрыем новую старонку інвесціравання катарскай дзяржавы ў эканоміку Беларусі. І такім чынам можам значна пашырыць наша супрацоўніцтва», — лічыць кіраўнік беларускай дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка перадаў запрашэнне эміру Катара наведаць Беларусь.

У сваю чаргу дзяржаўны міністр выказаў меркаванне, што такі буйны інвестыцыйны праект, рэалізаваны ў Мінску, паслужыць добрым прыкладам для астатніх катарскіх бізнесменаў. Ён адзначыў, што эмір таксама задаволены праектам і накіраваў яго ў Беларусь для абмеркавання магчымасцей па пашырэнні і паглыбленні двухбаковага супрацоўніцтва.

* * *

У Дзень Незалежнасці Беларусі катарскія інвестары пазнаёміліся з будаўніцтвам гасцінічнага комплексу, які ўзводзіцца на праспекце Пераможцаў.

Фота Надзеі БУЖАН.

У мерапрыемстве прынялі ўдзел памочнік Прэзідэнта па нацыянальнай бяспецы Віктар Лукашэнка, міністр абароны Беларусі генерал-лейтэнант Андрэй Раўкоў, дзяржаўны міністр па пытаннях абароны Катара Хамад Бен Алі Аль-Атыя, старшыня Мінгарвыканкама Андрэй Шорац.

— Катар мае намер працягнуць інвестыцыйнае супрацоўніцтва з Беларуссю, — адзначыў памочнік міністра абароны Катара Тані Абдулрахман Аль-Кувары. — Будаўніцтва шматфункцыянальнага спартыўна-гасцінічнага комплексу ў Мінску — толькі пачатак інвестыцый Катара ў Беларусь. У нас у планах рэалізацыя яшчэ аднаго буйнога праекта. Магчыма, гэта будзе сюрпрызам для вашай краіны. Пакуль гэта сакрэт.

Агульная плошча комплексу, які складаецца з чатырох будынкаў, — 65 тысяч квадратных метраў. Будаўніцтва — на стадыі завяршэння. Комплекс узведзены на 80%. Зараз вядуцца аддзелачныя работы. Адкрыццё запланавана на верасень–кастрычнік гэтага года.

Вераніка КАНЮТА. *kanyuta@zviazda.by*

МАЛАДЫМ І АДКАЗНЫМ

Аляксандр Лукашэнка зацвердзіў рашэнні савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў.

У прыватнасці прызначаны стыпендыі Прэзідэнта Беларусі ў памеры Br876 тысяч штомесяц студэнтам і курсантам установ вышэйшай адукацыі (181 чалавек); заахвочвальныя стыпендыі фонду (Br720 тысяч у месяц) на адзін каляндарны год з уручэннем нагруднага знака лаўрэата фонду пераможцам міжнародных алімпіяд і канферэнцыі юных вучоных (4 чалавекі).

Прысуджаны таксама грашовыя прэміі (ад Br7,2 млн да Br9,9 млн) з уручэннем нагруднага знака лаўрэата фонду 19 пераможцам міжнародных алімпіяд па матэматыцы, фізіцы, інфарматыцы, экалогіі, хіміі, конкурсаў навукова-тэхнічных праектаў маладых вынаходнікаў.

Акрамя таго, заахвочаны грашовымі прэміямі 282 пераможцы шэрагу рэспубліканскіх і 27 пераможцаў іншых алімпіяд і конкурсаў па розных прадметах.

Кіраўнік дзяржавы таксама падпісаў распараджэнні аб аб'яўленні Падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь выпускнікам вышэйшых ваенных навучальных устаноў — ваеннаслужачым Узброеных Сіл, органаў дзяржаўнай бяспекі, супрацоўнікам органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях за выдатныя поспехі ў вучобе і ўзорнае выкананне воінскага абавязку.

НА МЯЖЫ — У ЧАРГУ. ЭЛЕКТРОННУЮ

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ № 305 «Аб сістэме электроннай чаргі транспартных сродкаў у пунктах пропуску».

Указам прадугледжваецца магчымасць браніравання часу ўезду ў аўтадарожныя пункты пропуску праз Дзяржаўную граніцу Рэспублікі Беларусь фізічных і юрыдычных асоб, якія выязджаюць з Беларусі шляхам выкарыстання сістэмы электроннай чаргі транспартных сродкаў, што прыбываюць у пункт пропуску; функцыянаванне зон чакання; парадак кіравання работай сістэмы электроннай чаргі; спагнанне платы за браніраванне ў сістэме электроннай чаргі часу ўезду транспартных сродкаў у пункты пропуску; парадак збору, захавання і выкарыстання інфармацыі аб транспартных сродках і асобах, якія перасякаюць Дзяржаўную граніцу Рэспублікі Беларусь, і адказнасць за выдаванне такой інфармацыі.

Выкарыстанне сістэмы электроннай чаргі дасць магчымасць вадзіцелям транспартных сродкаў папярэдне забраніраваць час уезду ў пункт пропуску, упарадкаваць чэргі перад пунктамі пропуску, забяспечыць бяспеку дарожнага руху і падтрыманне правапарадку на тэрыторыі, што прылягае да пунктаў пропуску, а таксама знізіць фінансавыя страты транспартных кампаній і ўладальнікаў грузаў.

Асобы, якія не скарысталіся гэтай паслугай, будуць уязджаць у пункты пропуску ў парадку жывой чаргі.

З ЯПОНІІ — У «ЗУБРАНЯ»

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў распараджэнне аб выдзяленні сродкаў для арганізацыі адпачынку ў Беларусі японскіх дзяцей, якія пацярпелі ад аварыі на АЭС «Фукусіма».

Згодна з дамоўленасцямі з японскага боку ў Беларусі ў перыяд з 23 ліпеня па 9 жніўня пройдуць аздараўленне 32 дзіцяці з Японіі. Адпачынак японскіх дзяцей будзе арганізаваны ў нацыянальным дзіцячым адукацыйна-аздараўленчым цэнтры «Зубраня».

У праграму адпачынку ўключаны адукацыйныя, аздараўленчыя і забаўляльныя мерапрыемствы. Падчас разнастайных экскурсій будзе арганізавана азнаямленне з гістарычнай і культурнай спадчынай Беларусі. Акрамя таго, дзеці з Японіі пройдуць розныя медыцынскія працэдуры.

Запрашэнне японскіх дзяцей на адпачынак і аздараўленне ў Беларусь сведчыць пра гатоўнасць беларускай дзяржавы аказаць падтрымку і падзяліць бяду простых людзей, якія, як некалі і беларусы, пацярпелі ад тэхнагеннай катастрофы.

Паводле БЕЛТА.

■ Ніколі не забудзем

ГЭТА ТРЭБА ЖЫВЫМ...

У Валожыне ўвекавечылі памяць мірных жыхароў, расстраляных фашыстамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны

На валожынскім стадыёне мясцовая дзятва, ды і не толькі, заўсёды гуляла ў футбол. Побач — воінскае пахаванне, якое вянчае помнік у выглядзе смуткуючай жанчыны. Пакрысе ў горадзе з'явіліся больш сучасныя спартыўныя аб'екты і стадыён апусцеў. Было вырашана пабудаваць на гэтым месцы жылыя дамы. Але раптам усё перайначылася — тут высадзілі некалькі алей дрэўцаў, ледзь не на вачах вырас малады сад, а днямі з'явіўся яшчэ адзін помнік. Атрымаўся цэлы мемарыял, і так павінна было здарыцца: на гэтым месцы ў гады вайны забілі дзясяткі людзей.

На шчасце, пра тое, што тут адбылося ў гады вайны, своечасова расказалі мясцовыя жыхары. Інфармацыя пацвердзілася падчас падрыхтоўкі да будаўніцтва. На месца выехалі вайскоўцы 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна Міністэрства абароны. Дзякуючы ім стала вядома, што ў 1941—1942 гадах тут былі расстраляны 107 чалавек. Улічваючы тое, што ў жніўні 1941 года ў Валожыне было створана яўрэйскае гета, мяркуецца, што астанкі, знойдзеныя на стадыёне, належаць менавіта яго насельнікам.

Вядома, будаўніцтва адразу ж спынілі. Але гэта гісторыя настолькі ўразіла генеральнага дырэктара прадпрыемства «Трайпл» Юрыя Чыжа, што ён выступіў з ініцыятывай увекавечыць памяць бязвінна загінулых людзей. Каля помніка «Маці смуткуе», створанага ў 1961 годзе, усталявалі гарызантальную гранітную пліту, уладкавалі падыход да мемарыяла.

— Група кампаній «Трайпл» вядзе актыўную дзейнасць на тэрыторыі Беларусі, — гаворыць яе **генеральны дырэктар Юрый ЧЫЖ**. — Шэраг праектаў мы ажыццяўляем і на зямлі Валожына. У працэсе рэалізацыі аднаго з іх мы наткнуліся на чарговую страшную таямніцу, шмат якіх захоўвае наша беларуская зямля. На гэтым месцы яшчэ раз пераканаліся ў тым, якой цаной здабыта мірнае неба і ўсе нашы працоўныя подзвігі, што сёння здзяйсняем. Мы ніколі не павінны забывацца пра гэта. Нам трэба выхоўваць моладзь так, каб яна памятала і стаяла насмерць за нашу краіну.

Напярэдадні Дня Незалежнасці тут, у гэтым ціхім куточку Валожына, было надзвычай шматлюдна. Падчас урачыстага адкрыцця мемарыяльнай пліты сабраліся прадстаўнікі розных канфесій, нацыянальнасцяў. З'ехаліся, каб разам ушанаваць памяць тых, хто не дажыў да гэтага святога дня, да 70-годдзя Вялікай Перамогі.

— Нашы суайчыннікі гінулі на франтах Вялікай Айчыннай, гінулі партызаны, падпольшчыкі, на жаль, у гады вайны мы страцілі вельмі шмат і мірных грамадзян: дзяцей, старых, жанчын, — адзначыў падчас цырымоніі адкрыцця **старшыня Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Сямён ШАПІРА**. — Фашысты не шкадавалі нікога. Сёння статыстыка гаворыць пра тое, што больш за мільён нашых землякоў было закатавана ў канцлагерах. Велізарную страту панёс яўрэйскі народ. Больш чым 800 тысяч жыхароў нашай краіны з іх ліку загінула ў лагерах смерці, засценках гета. Прайшло 70 гадоў з заканчэння Вялікай Айчыннай вайны, а ў многіх краінах перапісваюць гісторыю, даюцца іншыя ацэнкі гэтай страшнай трагедыі. Але наш Прэзідэнт і мудры беларускі народ робяць усё дзеля таго, каб мы не забывалі ўрокі Другой сусветнай вайны, каб памяталі і цанілі тыя велізарныя ахвяры, якія панёс савецкі народ у імя мірнага жыцця.

Як пераканаць **пасол Ізраіля ў Беларусі Іосіф ШАГАЛ**, па традыцыі яго народа чалавек жывы да таго часу, пакуль мы памятаем яго імя. «Гэта жахліва, што зрабілі фашысты ў часы Другой сусветнай вайны тут, на шматпакутнай беларускай зямлі, — лічыць пасол. — Але яшчэ жахлівей, калі мы забываем імёны гэтых ахвяр. Абрываецца сувязь пакаленняў — і мы застаёмся ні з чым. Усе няшчасныя, людзі розных нацыянальнасцяў, расстраляныя тут, на гэтым месцы, сёння, напэўна, глядзяць на нас зверху, і душы іх супакояцца, бо мы пра іх памятаем».

Здавалася, ужо не засталося сведак таго, што адбылося на гэтым стадыёне больш чым 70 гадоў таму. Але сярод натоўпу адшукаліся людзі, якія сказалі, што ёсць адзін. Ёсць! Праўда, на цырымоніі яго не было. Журналісцкая цікаўнасць прывяла да адной з валожынскіх хат, на ганак якой пасля доўгага стуку ў вокны выйшаў старэнькі дзядуля.

Калі расстрэльвалі людзей, **Пятру ГАСПАРЭВІЧУ** было 14 гадоў. У той дзень ён якраз ішоў са школы. Як раптам пачулі з таварышамі стрэлы.

— Нас чацвёра дзяцей у тую школу хадзіла, — удакладняе Пётр Барысавіч. — «Пах-пах-пах» — раздавалася каля стадыёна. Гэта было па восені: прыкладна ў верасні-кастрычніку 1942 года. Прыйшлі дамоў. Маці з бацькам пачалі крычаць, што павольна ішлі. Мы пытаемся, што такое. А яны так і кажуць: «На стадыёне людзей страляюць».

Нягледзячы на тое, што сёння дакладна не ўстаноўлена, каго ж усё-такі забілі тады фашысты, Пётр Гаспарэвіч настойвае, што сярод ахвяр былі толькі людзі з яўрэйскага гета, а значыць, яўрэі. Іншыя ж кажуць, што былі там і беларусы, а таксама некалькі чырвонаармейцаў: калі падымалі астанкі, знайшлі салдацкія боты, каску, рэмень, кажух. Магчыма, мы ніколі не даведаемся, да якой нацыянальнасці належалі гэтыя людзі. Затое будзем дакладна ведаць, дзе яны пахаваны.

— Вайна без ахвяр, вядома, не бывае, — кажа былы вязень Мінскага гета, 9 канцэнтрацыйных лагераў **Леанід РУБІНШТЭЙН**. — Але адна справа, калі на фронце людзі ваююць і гінуць. Жахліва тое, што ў гэтай вайне растралялі мірных жыхароў. І віна іх была толькі ў тым, што яны нарадзіліся яўрэямі. Мы, былыя вязні, не абыякавыя да таго, што тут адбывалася. І кожны помнік, які адкрываецца, для нас вельмі каштоўны. Ідуць гады, хутка не застанецца ніводнага жывога сведкі тых падзей, а помнік будзе стаяць. І ён будзе сведкам той трагедыі, якая адбывалася тут, у Валожыне.

Вераніка КАНЮТА. *kanyuta@zviazda.by*
Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.
Валожынскі раён

■ Свята ў рэгіёнах

СЛАВА САПРАЎДНЫМ ПРАФЕСІЯНАЛАМ!

Звесткі аб васьмі жыхарах Прынямоння занесены ў Кнігу славы Гродзенскай вобласці. Цырымонія ўручэння ім адпаведных пасведчанняў адбылася ў абласным драматычным тэатры на ўрачыстым сходзе, прысвечаным Дню Незалежнасці.

Адзін з сапраўдных прафесіяналаў, якіх вось так ушаноўваюць на Гродзеншчыне, — загадчык кафедры агульнай хірургіі Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Пётр Гарэлік. У яго шматгадовай практыцы — сотні розных аперацый. Сёлета Пётр Васільевіч разам з калегамі выратаваў жыццё маладому чалавеку, які цяжка траўмаваўся падчас работы на дрэваапрацоўчым станку і быў літаральна на валаску ад смерці.

У Кнігу славы Гродзенскай вобласці занесены таксама звесткі пра Героя Сацыялістычнай Працы, былога старшыню калгаса на Іўеўшчыне Уладзіміра Баума (цяпер гаспадарка носіць яго імя), прадаўца Раісу Бубешку з Мастоўскага раёна, старшыню Іўеўскага раённага савета ветэранаў Аляксея Гончанку, дырэктара філіяла «Жалудоцкі агракомплекс» ААТ «Агракамбінат Скідальскі» Станіслава Гузеня, старшыню СВК імя Варанецкага Бераставіцкага раёна Іосіфа Коласа, генеральнага дырэктара прадпрыемства «Леор Пластык» (Навагрудскі раён) Барыса Кроціна, былога старшыню калгаса (цяпер — СВК «Міжэвічы» Слонімскага раёна) Эдуарда Арочку.

А прафесійныя і грамадскія заслугі яшчэ 25 чалавек учора адзначылі на мітынгу з нагоды Дня Незалежнасці. Старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Краўцоў уручыў ім дыпломы аб прысваенні звання «Чалавек года Гродзеншчыны» і прэміі. У вобласці гэта стала ўжо добрай традыцыяй.

ЛЯ ВОГНІШЧА ПАРТЫЗАНСКАЙ ЗАСТАВЫ

У Віцебску на галоўнай плошчы Перамогі адбыліся ўрачыстая цырымонія ўскладання вянкоў і кветак да манумента воінам-вызваліцелям і мітынг. А потым тысячы гараджан убачылі паказальныя выступленні ваенных.

У Гарадоцкім раёне прыемным падарункам для мясцовых жыхароў стала адкрыццё Дома рамёстваў і фальклору. Правялі рэгіянальны конкурс па пляценні з лазы. Упершыню адбыўся парад дэкаратыўных дзіцячых калясак «Маё першае аўто». Працаваў «Гасцінны панадворак» з народнай кухняй, гульнямі і забавамі. Вялікі інтарэс выклікала інтэрактыўная пляцоўка «Партызанская застава». На ёй можна было акунуцца ў атмасферу партызанскага побыту, пасядзець ля вогнішча, успомніць песні ваенных гадоў...

У Полацку адкрылі велічны абеліск у гонар войскаў 1-га Прыбалтыйскага фронту пад камандаваннем Баграмяна, якія вызвалялі горад ад акупантаў 2-4 ліпеня 1944 года.

У Глыбокім з'явілася скульптура «Дзед-глыбачанін». Правобразам паслужыў А.А. Сабалеўскі — бацька доктара тэхнічных навук, прафесара Ю.А. Сабалеўскага. Бюст апошняга ўсталяваны ў райцэнтры на Алеі знакамітых землякоў.

Святочныя мерапрыемствы прайшлі ва ўсіх гарадах і раённых цэнтрах Віцебскай вобласці.

ДАНІНА ПАШАНЫ І ПАМЯЦІ

У кожным з раёнаў Брэсцкай вобласці прайшлі святкаванні Дня незалежнасці. У прыватнасці, у Баранавічах звярнула на сябе ўвагу мерапрыемства пад назвай «Саюз апаленых вайною сэрцаў». Аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі разам з гарадскім ЗАГСам ушанавалі сямейныя пары, дзе адзін з сужэнцаў быў непаўналетнім вязнем фашысцкіх лагераў.

10-гадовым дзіцем апынуўся на чужыне Афанасій Заградскі. Вярнуўшыся дадому, хлопец скончыў школу, атрымаў адукацыю і большасць працоўнага жыцця аддаў транспартнай галіне краіны. Шмат гадоў Афанасій Афанасьевіч працаваў дырэктарам аўтобуснага парка ў Баранавічах. 57 гадоў ідзе ён па жыцці разам з жонкай Таццянай Аляксандраўнай. Ажаніліся ў далёкім 1958 годзе ў такі ж ліпеньскі дзень. Сужэнцаў Заградскіх і яшчэ тры пары гараджан, якія добра ведаюць, што такое вайна, цёпла павіншавалі прадстаўнікі грамадскага аб'яднання «Белая Русь», калегі-ветэраны, моладзь.

Гісторыка-краязнаўчы музей Івацэвічаў сабраў шмат гледачоў на акцыі «Споведзь салдацкіх сэрцаў». Асноўны змест мерапрыемства склалі лісты з фронту, напісаныя больш за семдзесят гадоў таму землякамі.

Асноўныя мерапрыемствы адбыліся ў Брэсцкай крэпасці. Кіраўнікі вобласці і горада на чале са старшынёй аблвыканкама Анатолем ЛІСАМ усклалі кветкі да Вечнага агню. Пасля ўшанавання памяці хвілінай маўчання ўрачыстым маршам па плошчы Цырыманіялу прайшлі воіны Брэсцкага гарнізона.

УСЁ ДЛЯ ЗДАРОЎЯ

У Магілёве аднавілі рэнтгеналагічнае аддзяленне ў гарадской бальніцы №1, а ў Клічаўскім раёне мадэрнізавалі ўрачэбную амбулаторыю і адкрылі бальніцу сястрынскага догляду.

Рэнтгеналагічнае аддзяленне бальніцы, якое некалькі дзесяцігоддзяў не ведала рамонту, сёння атрымала другое жыццё. Акрамя таго, што памяшканні набылі сучасны выгляд, тут усталяваны высокатэхналагічны камп'ютарны тамограф, які дазволіць рабіць дыягностыку захворванняў на самых ранніх этапах.

Па словах галоўнага ўрача бальніцы Віктара Клачкова, новае абсталяванне ставіць бальніцу ў разрад установ рэспубліканскага ўзроўню. Камп'ютарны тамограф дазваляе зрабіць 160 зрэзаў за адзін абарот рэнтгенаўскай трубкі, што вельмі важна для візуалізацыі сасудаў у органах з інтэнсіўным кровазваротам.

Старшыня Магілёўскага гарвыканкама Уладзімір ЦУМАРАЎ падчас урачыстага адкрыцця адзначыў, наколькі гэта важны для горада аб'ект, і выказаў спадзяванне, што якасць медыцынскага абслугоўвання гараджан яшчэ больш палепшыцца. Ён таксама паведаміў, што ў горадзе рыхтуецца праграма паэтапнай мадэрнізацыі ўстаноў аховы здароўя і ўжо вядома, якія з іх туды ўвойдуць.

Добрым падарункам жыхарам Клічаўскага раёна стала адкрыццё пасля капрамонту з мадэрнізацыяй Доўгаўскай урачэбнай амбулаторыі і ў гэтым жа будынку — бальніцы сястрынскага догляду на 20 ложкаў.

— Наогул у раёне шмат робіцца для паляпшэння ўмоў абслугоўвання насельніцтва, — адзначыла **намеснік галоўнага ўрача Клічаўскай раённай бальніцы Дзіяна ЛУК'ЯНАВА**. — Летась нарэшце справіла наваселле раённая паліклініка, якая 5 гадоў тулілася ў розных памяшканнях. Цяпер гэта сучасная ўстанова, якая мае на ўзбраенні добрае медыцынскае абсталяванне.

Барыс ПРАКОПЧЫК. *prakopchik@zviazda.by*
Аляксандр ПУКШАНСКІ. *pukshanski@zviazda.by*
Святлана ЯСКЕВІЧ. *yackevich@zviazda.by*
Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

У Дзень Незалежнасці ў Гомелі адбылося святочнае шэсце ветэранаў, працоўных калектываў і грамадскасці горада.

ЯК СВЯТКАВАЛІ ДЗЕНЬ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ НАШЫ ПАСОЛЬСТВЫ ЗА МЯЖОЙ

Прыёмы, выставы, цырымоніі ўскладання вянкоў, паказ відэафільмаў пра Беларусь — такія мерапрыемствы арганізавалі дыпламатычныя ўстановы за мяжой.

З нагоды Дня Незалежнасці нашай краіны ў Маскве адбылася ўрачыстая цырымонія ўскладання вянка да Магілы Невядомага салдата ля Крамлёўскай сцяны і кветак да памятных знакаў «Горад-герой Мінск», «Брэсцкая крэпасць-герой» у Аляксандраўскім садзе.

Урачыстыя мерапрыемствы, па інфармацыі прэс-службы МЗС, былі арганізаваны ў нашых пасольствах у Азербайджане, Аргенціне, Аўстрыі, Бельгіі, В'етнаме, Ізраілі, Карэі, Латвіі, Манголіі, Польшчы, Сербіі, Таджыкістане, Эстоніі. У рамках прыёму ў сталіцы Ізраіля Тэль-Авіве адкрылася фотавыстава «Зямля пад белымі крыламі», у Эстоніі была прадстаўлена выстава дзіцячых малюнкаў «Казачная Беларусь», у Латвіі арганізавалі выставу «Беларускія прысмакі».

Надзея ЮШКЕВІЧ.
yushkevich@zviazda.by

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь выказвае шчырыя спачуванні намесніку начальніка ўпраўлення друкаваных СМІ і знешніх сувязяў Гусаковай Галіне Вітальеўне ў сувязі з напаткаўшым яе горам — смерцю МАЦІ.

РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» выказвае глыбокія спачуванні намесніку начальніка ўпраўлення друкаваных СМІ і знешніх сувязяў Гусаковай Галіне Вітальеўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю МАЦІ.

Извещение о проведении 24 июля 2015 г. повторных торгов по продаже имущества, на которое обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства, неуплаченных пеней

Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)		
Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества	Начальная цена, бел. руб.	Размер задатка, бел. руб.
Квартира однокомнатная площадью 39,7 кв.м, лоджия 3,3 кв.м инв. №600/С-135464, 600/D-73302, 2011 г. постройки, расположенная по адресу: Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, а.г. Новый Двор, ул. Счастливая, д. 5, кв. 6	568 583 000	56 858 000
Организатор аукциона	УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, (017) 327-40-22	
Балансодержатель	СП «Унибокс» ООО	
Обременение	Имущество обременено договором найма жилого помещения	

Организатор аукциона – УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, представившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Задаток перечисляется на расчетный счет №3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369; получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583. Для участия в аукционе по нескольким предметам торгов необходимо внести задаток в размере, установленном для предмета торгов с наибольшей начальной ценой. Сумма задатка для участия в аукционе должна быть внесена в срок, установленный для приема документов.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион проводится **24 июля 2015 г. в 15.30** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 06.07.2015 по 21.07.2015 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: (017) 327-40-22, (017) 327-48-36 – УП «Минский городской центр недвижимости».

Утерянные студенческие билеты УО «БНТУ» на имя СЛЕПЦОВА Владимира Петровича и на имя СКОРОБОГАТОВА Дмитрия Валерьевича **считать недействительными.**

Утерянные студенческие билеты УО «БНТУ» группы 103220 на имя КРОПЫ Антона Игоревича и на имя РУЛЬКЕВИЧ Екатерины Юрьевны **считать недействительными.**

■ Надвор'е

СПЯКОТА ЗАШКАЛЬВАЕ

У выхадныя чакаецца да 34 цяпла

Ліпень у Беларусі амаль з першых дзён паказвае, што менавіта ён з'яўляецца самым гарачым месяцам года. Вось і ў найбліжэйшыя дні нас чакае анамальная спякота. Спецыялісты Белгідраметцэнтра паведамляюць, што ў выхадныя надвор'е ў краіне будзе вызначаць антыцыклон, які сфарміраваны ў цёплай паветранай масе.

Таму ў суботу і нядзелю ападкаў увогуле не чакаецца, а тэмпература паветра пачне павялічвацца. Уначы прагназуецца плюс 12-18 градусаў, а ўдзень стане прыпякаць да 28-34 цяпла. Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у першыя дні наступнага тыдня стане яшчэ гарачэй. У панядзелак надвор'е на большай частцы тэрыторыі краіны будуць вызначаць вобласць павышанага атмасфернага ціску і трапічныя паветраныя масы, якія перамяшчаюцца з паўднёвага захаду Еўропы. Пераважна без ападкаў, толькі ўдзень па паўночным захадзе пройдуць кароткачасовыя навальнічныя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе 13-20 цяпла, удзень — плюс 28-34 градусы, а месцамі — нават да 35-36 цяпла. Толькі ў Віцебскай вобласці ў гэты дзень прагназуецца да плюс 25-27 градусаў.

Ужо традыцыйна сіноптыкі нагадваюць нам, што пры такім сухім і гарачым надвор'і ў краіне захоўваецца складанае пажаранебяспечнае становішча. У сувязі з гэтым спецыялісты раяць не забывацца пра асцярожнае абыходжанне з агнём і з разуменнем ставіцца да забароны наведвання лясоў і развядзення вогнішчаў.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

■ Прыёмная кампанія — 2015

Колькасць стабальнікаў павялічылася больш чым удвая

Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў не спяшаецца ў гэтым годзе з абвяшчэннем вынікаў аналізу праверкі работ удзельнікаў цэнтралізаванага тэсціравання. Менш чым за тыдзень да пачатку прыёму дакументаў у ВНУ невядома, колькі абітурыентаў не пераадолелі ўстаноўлены мінімальны парог і не змогуць удзельнічаць у прыёмнай кампаніі. Нагадаем, што ў гэтым годзе мінімальныя парогі ўстаноўлены для першай і другой профільнай дысцыпліны, таму падлікі ўскладняюцца. Не абвяшчаецца і інфармацыя пра абітурыентаў, якія атрымалі максімальныя балы па тых ці іншых прадметах.

У прэс-службе Міністэрства адукацыі паведамілі, што яшчэ не правераны работы ўдзельнікаў ЦТ па дзвюх дысцыплінах плюс работы абітурыентаў, якія здавалі ЦТ у рэзервовы дзень (2 ліпеня). Але ўжо зразумела, што колькасць уладальнікаў стабальных сертыфікатаў будзе сёлета большай, чым летась. На сёння ёсць ужо 277 стабальных вынікаў. У мінулым годзе па ўсіх дысцыплінах 100 балаў выстаўляліся 122 разы.

Вядома таксама, што на ЦТ па матэматыцы 100 балаў атрымалі 89 чалавек, а на ЦТ па рускай мове — 83 чалавекі. У 2014 годзе максімальныя балы на матэматыцы здолелі набраць усяго 16 удзельнікаў экзамену, а па рускай мове — 25 чалавек.

Былі летась таксама і тры ўладальнікі двух стабальных сертыфікатаў. Ці будуць у гэтым годзе такія бліскучыя вынікі? У Міністэрстве адукацыі абяцаюць, што больш поўны аналіз ЦТ будзе зроблены толькі праз тыдзень...

Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

■ Крэдытная ракіроўка

З ВАЛЮТЫ — У РУБЛІ

Рэшткі крэдытаў у замежнай валюце фізічным асобам цяпер можна выплочваць у беларускіх рублях. Такую магчымасць сваім кліентам прадаставіў Беларусбанк.

Рашэнне аб магчымасці пагашэння насельніцтвам валютных крэдытаў у рублях прынята дзеля таго, каб знізіць нагрузку на грамадзян пры пагашэнні такіх пазык. У дэпартаменце крэдытавання насельніцтва Беларусбанка нам патлумачылі, што магчымасць такой «ракіроўкі» тычыцца ўсіх відаў крэдытаў, у тым ліку спажывецкіх і выдадзеных на будаўніцтва і набыццё нерухомасці. У прэс-службе банка таксама паведамілі, што найбуйнейшай банкаўскай установе людзі сёння вяртаюць каля 5 тысяч крэдытаў у замежнай валюце. Большасць з іх была ўзята на фінансаванне нерухомасці. З 2009 года выдача валютных крэдытаў не ажыццяўляецца, таму практычна ўсе спажывецкія крэдыты ў доларах і еўра ўжо пагашаны.

Намеснік дырэктара дэпартамента крэдытавання насельніцтва Беларусбанка Святлана ФІЛІПЧУК патлумачыла, што пераводзіць запазычанасць у рублі будуць па курсе продажу замежнай валюты, які дзейнічае для правядзення аперацый пры выкарыстанні банкаўскіх плацежных картак банка. Зразумела, што зменяцца ў гэтым выпадку і памеры працэнтаў па крэдыце. Пасля пераводу валютных крэдытаў у рублёвыя працэнтная стаўка па крэдытах на нерухомасць складзе 35% гадавых, па спажывецкіх крэдытах — 43% гадавых. Канчатковыя тэрміны пагашэння крэдытаў застануцца ранейшымі.

Існуе ў банка і пэўны алгарытм пераводу крэдытаў. Па-першае, кліенту трэба звярнуцца з заявай менавіта ў тое аддзяленне банка, дзе ён раней атрымліваў крэдыт. Там крэдытаатрымальніку і яго паручыцелям (калі яны ёсць) неабходна будзе прадаставіць у банк дакументы, якія пацвярджаюць даходы. Як правіла, гэта даведка аб даходах з месца працы. Пасля гэтага банк ацэньвае крэдытаздольнасць крэдытаатрымальніка (паручыцеля) і афармляе дадатковае пагадненне да крэдытнага дагавора з указаннем запазычанасці ў беларускіх рублях. Акрамя таго, разам з пераводам крэдыту ў рублёвую зону крэдытаатрымальніку банк дае дадатковы бонус: цяпер у таго з'явіцца магчымасць пагасіць крэдыт датэрмінова з аплатай працэнтаў за фактычны час карыстання крэдытам.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

■ Замежны шопінг

Трэба будзе плаціць дадатковы збор?

Нацбанк вывучыць магчымасць такога спагнання пры куплі фізасобамі тавараў з-за мяжы праз інтэрнэт

Пасля гэтага адпаведныя прапановы будуць накіраваны ў Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу. Гэта вынікае з каментарыя ўпраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацыянальнага банка адносна ліста, разасланага днямі рэгулятарам камерцыйным банкам.

У лісце (копія якога ёсць у БЕЛТА) банкам прапанавана да 6 ліпеня выказаць меркаванні аб магчымасці і мэтазгоднасці збірання дадатковага збору на этапе аплаты тавараў з выкарыстаннем банкаўскай аплатнай карткі ў сетцы інтэрнэт. Таксама агучана просьба прыняць да ўвагі наяўнасць у банка магчымасці падзелу плацяжоў у інтэрнэце па іх відах, сённяшнія спосабы аплаты ў глабальнай сетцы, міжнародную практыку выкарыстання дадатковых збораў і абмежаванняў пры куплі тавараў праз інтэрнэт.

«Нацыянальны банк заўсёды імкнецца аператыўна рэагаваць на ініцыятывы і прапановы, якія з'яўляюцца ў грамадстве, органах дзяржкіравання па аспектах, што закранаюць дзейнасць рэгулятара і банкаўскай сістэмы ўвогуле. Пры гэтым для фарміравання аргументаванага меркавання па тым ці іншым пытанні яго неабходна найперш усебакова вывучыць», — сказалі ў галоўным банку краіны. Нядаўна прапанову спаганяць падатак з пакупак беларускіх грамадзян у замежных інтэрнэт-крамах выказаў старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл Мясніковіч.

Андрэй БЫКАЎ

■ Фестывалім!

НА КУПАЛЛЕ Ў АЛЕКСАНДРЫІ ЧАКАЮЦЬ 70 ТЫСЯЧ ГАСЦЕЙ

Сёння ў Шклоўскім раёне пачынае працаваць вялікі купальскі кірмаш з канцэртамі і забаўляльнымі мерапрыемствамі шостага фестывалю «Александрыя збірае сяброў».

Лепшага адпачынку ў спякотны дзень, як на беразе Дняпра, ад якога вее прыемнай прахалодай, і не прыдумаеш. Тым больш што сёлетні фестываль як ніколі насычаны мноствам розных падзей.

— На яго прыедуць звыш 2000 прафесійных і самадзейных артыстаў, майстроў і рамеснікаў, — паведаміў **начальнік упраўлення ідэалагічнай працы, культуры і па справах моладзі Магілёўскага аблвыканкама Анатоль СІНКАВЕЦ**. — Шмат удзельнікаў прыбудзе з Расіі і Украіны.

Купальскае свята ў Александрыі з кожным годам становіцца ўсё больш цікавым для іншых краін. Прычым не толькі для творчых калектываў.

— У мерапрыемстве прымаюць удзел дыпламаты 32 краін, якія перад тым, як наведаць Александрыйскі кірмаш, пабываюць у Бабруйску і пазнаёмяцца з яго прамысловым патэнцыялам, паглядзяць аграсядзібы Магілёўскай вобласці, нагул ацэняць турыстычныя магчымасці нашага рэгіёна, — адзначыў **намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый МАЛАШКА**.

Вельмі разнастайная культурная праграма фестывалю. Будзе працаваць вялікая маладзёжная пляцоўка. Сёння тут пройдзе конкурс «Уладар сяла», у якім прымуць удзел маладыя сем'і з усёй Магілёўскай вобласці. Можна будзе паназіраць, з якой спрытнасцю яны пілуюць дровы, гатуюць ежу, вядуць гаспадарку і нават спяваюць песні. Запланавана работа выставачнай тэматычнай экспазіцыі маладзёжных праектаў «Нашы ідэі табе, Беларусь», якая прадставіць працу чатырох пляцовак пад эгідай рэспубліканскага маладзёжнага конкурсу «100 ідэй для Беларусі»: «Навука Аграрная», «Навука Універсітэцкая», «Будаўніцтва. Навука. Тэхніка» і « Інтэрактыўная маладзёжная пляцоўка». Маладыя вынаходнікі і навукоўцы паведамяць, як атрымаць электрычную энергію за кошт плыні вады ў рацэ, параяць, як знайсці свой стыль, і нават падкажуць, як пабываць у іншай рэальнасці.

Александрыйскі фэст будзе доўжыцца два дні амаль без перапынку. Пасля мюзікла «Папараць-кветка» з удзелам расійскіх зорак — Кацярыны Шаўрынай і Ігара Карнелюка — адбудзецца святочны феерверк, потым да 3 гадзін раніцы будзе працаваць маладзёжная дыскатэка. Натхняць удзельнікаў будуць папулярныя беларускія дыджэі і групы «MBAND» з Расіі і «Дынама» з Украіны. У нядзелю працягнуць працаваць выставачныя і гандлёвыя пляцоўкі, адбудзецца канцэрт Кацярыны Шаўрынай і Ігара Карнелюка.

Арганізатары чакаюць, што фестываль наведае каля 70 тысяч чалавек. Для іх будуць працаваць выязныя кавярні, дзе можна будзе пакаштаваць розныя прысмакі.

Да месца падзей можна дабрацца чыгуначным, грамадскім аўтамабільным, а таксама асабістым транспартам. Беларуская чыгунка прызначыла на 4-5 ліпеня дадатковыя цягнікі рэгіянальных ліній эканомкласа, якія будуць курсіраваць па маршруце Магілёў — Шклоў — Копысь (Александрыя) — Шклоў — Магілёў і Орша — Копысь (Александрыя) — Орша. У нядзелю апошні дадатковы цягнік з Копысі адправіцца ў Магілёў у 3.30 ночы.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

Усё прыйшло часова
ў гэты свет
І адплыве аднойчы
з вечнай плынню.
Калі стагоддзі
змыюць з камню след —
Не забывайце тых,
хто след пакінуў.

Не забывайце
іх апошні бой,
Дзе смерць дала
ўсім свае імёны...
Прад Вечнасцю
адзін раўняюць строй
Салдат вядомы
побач з невядомым.

Яўгена ПЯСЕЦКАГА ФОТА СЛОВА

Не ўсе імёны ўдзельнікаў вайны дайшлі да нас праз вогненнае ліхалецце. Але, нават калі чыесьці прозвішчы і сёння застаюцца невядомымі, мы ведаем іх агульнае імя: героі.

Мінчанін Віктар Талмачоў — беражліва захоўвае ўсё, што нагадвае пра яго бацьку, лейтэнанта Пятра Талмачова. Ваенны лётчык загінуў летам 1942 года далёка ад беларускай зямлі. Яго апошні бой стаў адным з многіх, якія набліжалі Перамогу. Віктар Талмачоў з партрэтам свайго бацькі сустрэўся мне каля Вечнага агню на мінскай плошчы Перамогі.

Ад гэтай плошчы па праспекце Незалежнасці блізка да месца, дзе я зрабіў наступны фотаздымак. Гэты помнік — адзін з самых невялікіх у сталіцы, але вельмі значны для нашай памяці. На гранітнай пліце сімвалічна перададзены апошнія сляды: адбіткі пакінулі тыя, хто выйшаў змагацца супраць захопнікаў. На гэтым месцы акупанты каралі смерцю вядомых і невядомых сёння патрыётаў.

■ Транспарт

З ПОЎНАЧЫ НА ПОЎДЗЕНЬ

Першыя станцыі новай лініі метро запрацуюць ужо праз тры гады

Аб гэтым паведаміў начальнік дырэкцыі па будаўніцтве Мінскага метрапалітэна Павел ЦАРУН. Спецыяліст адразу нагадаў, што ўсяго на трэцяй лініі метро плануецца ўвесці ў эксплуатацыю 14 станцый ад Зялёнага Луга да Курасоўшчыны, плюс тры перасадачныя вузлы. Працягласць лініі складзе больш за 17 кіламетраў.

ПЕРШЫ ПУСКАВЫ КОМПЛЕКС УЖО БУДУЕЦЦА

У першую чаргу будаўніцтва ўвойдуць сем станцый, а ў пачатковы пускавы комплекс — чатыры. Тэрміны ўводу апошніх удакладняюцца, але арыенціровачна іх плануюць пабудаваць напрыканцы 2018-га ці ў пачатку 2019 года. Работы па праектаванні і будаўніцтве лініі ўжо пачаліся. Першымі запланавана пабудаваць станцыі «Кавальская Слабада», «Вакзальная», «Плошча Багушэвіча» і «Юбілейная» — «Плошча Леніна» на «Вакзальную», другі — са станцыі «Плошча Юбілейная» на «Фрунзенскую». Сталічныя транспартнікі ўпэўнены, што гэта дазволіць істотна разгрузіць вельмі ажыўлены вузел «Купалаўская» — «Кастрычніцкая». Будаўнічая працягласць першага комплексу складзе 4,3 кіламетра, а эксплуатацыйная — 3,3 кіламетра.

ВЕСТЫБЮЛЬ «ВАКЗАЛЬНАЙ» ВЫЙДЗЕ НА ПАВЕРХНЮ

Транспартнікамі сёння ажыццяўляецца перакладка інжынерных сетак на пляцоўцы будаўніцтва злучальнай веткі паміж другой і трэцяй лініямі Мінскага метрапалітэна, якая арыенціровачна праходзіць ад скрыжавання вуліц К. Цэткін — Кальварыйская да скрыжавання праспект Дзяржынскага — вуліца К. Цэткін. Даўжыня гэтай веткі складае каля 900 метраў. Завяршаецца перакладванне інжынерных сетак у раёне будучых станцый метро «Кавальская Слабада» і «Вакзальная», пачалося будаўніцтва першага і другога аб'ездаў непасрэдна для станцыйнага комплексу «Кавальская Слабада». А вось перакладка інжынерных сетак на тэрыторыі будучай станцыі «Юбілейная плошча» патрабуе ў далейшым частковага закрыцця вуліц Караля і Сухой. Упершыню на станцыі «Вакзальная» будзе пабудаваны наземны вестыбюль.

ТРАВАЛАТАРЫ І ІНДЫВІДУАЛЬНЫ СТЫЛЬ

Трэцяя лінія Мінскага метро будзе максімальна аўтаматызавана, упэўнены кіраўнік будаўніцтва падземкі. Пры руху цягнікоў за машыністам застануцца толькі кантрольныя функцыі. Плануецца ўкараніць сучасныя сістэмы бяспекі, відэаназіранне, безбар'ернага асяроддзя і кіравання тэхналагічным абсталяваннем. На новых станцыях усталююць травалатары (эскалатары без прыступак), як у аэрапортах. На станцыях таксама прадугледжана ўстаноўка ахоўнага экрана, што засцеражэ пасажыраў ад выпадковага ці наўмыснага падзення на рэйкі. Кожная станцыя будзе мець свой арыгінальны стыль.

БУДУЕМ ПА ГРАФІКУ

Сёлета на будаўніцтва аб'ектаў першага пускавога комплексу трэцяй лініі метрапалітэна выдзелена інвестыцыйнай праграмай Мінска 969,9 млрд рублёў. Акрамя бюджэтных рэсурсаў горада, для будаўніцтва былі прыцягнуты і крэдыты Банка развіцця ў памеры 500 млрд рублёў.

Спецыяліст паведаміў, што цяпер на аб'екце працуюць каля 400 чалавек. Пры раскрыцці фронту работ да будаўніцтва будуць прыцягнуты супрацоўнікі аб'яднання «Мінскбуд». «Сёння тэмпы будаўніцтва трэцяй лініі метрапалітэна ў асноўным вытрымліваюцца», — сказаў Павел Царун.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

ЦЯГНІК З НАШАГА ДЗЯЦІНСТВА

Дзіцячая чыгунка святкуе свой 60-ты сезон

У ліпені ў Мінску запланаваны шэраг мерапрыемстваў, прымеркаваных да 60-гадовага юбілею Дзіцячай чыгункі імя К.С. Заслонава Мінскага аддзялення Беларускай чыгункі. Святочная дата прыпадае на 9 ліпеня. Самі чыгуначнікі лічаць яе знакавай, паколькі менавіта тут, на Дзіцячай чыгунцы, многія з іх яшчэ школьнікамі вызначыліся з будучай прафесіяй і выбралі свой жыццёвы шлях.

Дзіцячая чыгунка сёння — гэта першая прыступка прафесійнага карпаратыўнага навучання, якую дзеці праходзяць, займаючыся ў гуртку «Юны чыгуначнік». У маі 2009 года быў адкрыты новы вучэбны цэнтр з профільнымі класамі і камп'ютарным кабінетам. За час працы цэнтра навучанне ў ім прайшлі больш за тры тысячы школьнікаў. Штогод выпускнікамі Дзіцячай чыгункі становяцца каля 40 юнакоў і дзяўчат. За гэты перыяд больш за 80 юных чыгуначнікаў паступілі ў адпаведныя навучальныя ўстановы.

Мерапрыемствы, прысвечаныя 60-годдзю Дзіцячай чыгункі, будуць праводзіцца да канца года. Так, у жніўні пройдзе выстава чыгуначнага мадэлявання. У верасні Мінскае аддзяленне разам з Беларускім прафсаюзам чыгуначнікаў і транспартных будаўнікоў плануе правесці фотаконкурс, прысвечаны гэтаму юбілею. У снежні будзе арганізаваны «Навагодні экспрэс».

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

Юная правадніца Часлава МІЛЬГУЙ ужо два гады на Дзіцячай чыгунцы і ў наступным годзе збіраецца паступаць у каледж на спецыяльнасць «Праваднік».

Лепшыя сябры Антон КАРОЛЬ і Павел ЮШКО чатыры гады таму разам прыйшлі на чыгунку. Яны ўжо заслужылі ганаровыя званні намеснікаў начальніка змены.

Дарэчы

Цягнік Дзіцячай чыгункі «Сталічны экспрэс» у летнім сезоне 2015 года будзе курсіраваць:

летам — па серадах, чацвяргах і пятніцах з 11.00 да 14.00, а па суботах і нядзелях — з 11.00 да 16.40;

у верасні — па суботах і нядзелях з 11.00 да 16.40.

Начальнікі цягніка Кірыл ІВАНОЎ і Раман МУСТАФАЕЎ правяраюць цягнік і гатоўнасць падначаленых перад кожным адпраўленнем.

■ Мы памятаем!

МОЙ ФІЛЬМ ПРА ВАЙНУ

Не так даўно на стыку кіно і літаратуры нарадзілася новая форма самавыяўлення — буктрэйлеры, асабліва папулярная ў моладзі. Гэта своеасаблівыя відэаанатацыі да кніг, якія выклікаюць у гледача зацікаўленасць літаратурным творам.

Мінскі гарадскі камітэт Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі прапанаваў юнакам і дзяўчатам праявіць сябе ў майстэрстве стварэння такіх ролікаў паводле сваіх любімых твораў пра вайну. Днямі ў Нацыянальнай бібліятэцы падводзілі вынікі рэжысёрскай працы моладзі. Дарэчы, з усімі ролікамі ўдзельнікаў можна пазнаёміцца ў групе «Мой фільм пра вайну» ў сацыяльнай сетцы «ВКонтакте», бо, як вядома, лепш аднойчы пабачыць, чым сто разоў пачуць.

Без сумнення, у кожным з ролікаў адчуваецца аўтарскае «я», свой погляд на тое, як зацікавіць чытача творамі ваеннай тэматыкі. Нехта карыстаўся ўрыўкамі з вядомых кінастужак, спрабуючы «ўзяць» спецэфектамі, нехта сам «экранізаваў» найбольш вядомыя сцэны з кніг, а хтосьці падыходзіў да справы лаканічна (але не значыць — няякасна!) і проста зачытваў урыўкі з твораў, выкарыстоўваючы ў якасці фону гістарычныя фотаздымкі.

Усяго ў конкурсе прынялі ўдзел больш як 200 чалавек са 127 ролікамі. На фінал з'ехаліся аўтары найлепшых відэа: школьнікі, студэнты і маладыя спецыялісты, якія здымалі буктрэйлеры. Як распавялі арганізатары, найбольшую ўвагу атрымалі такія аўтары, як Васіль Быкаў, Алесь Адамовіч, Міхаіл Шолахаў.

— Наш конкурс у пэўным сэнсе інавацыйны, — зазначыў падчас мерапрыемства **першы сакратар Мінскага гарадскога камітэта БРСМ Юрый ЧАЧУКЕВІЧ.** — Яго старт быў дадзены ў лютым, і вось цяпер мы сабраліся, каб адзначыць найлепшых. Мы вельмі часта гаворым пра мадэрнізацыю, маючы на ўвазе беларускую эканоміку, але, на нашу думку, яна павінна закрануць і сферу патрыятычнага выхавання. Такія конкурсы, як гэты, дапамогуць нам рухацца наперад.

— Нам было вельмі цікава папрацаваць у такім незвычайным фармаце, — распавяла **Ганна АЛЯШКЕВІЧ, студэнтка Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта**, якая разам з сяброўкамі зняла ролік паводле кнігі Святланы Алексіевіч «У вайны не жаночае аблічча». — На выбар твора, магчыма, паўплывала тое, што МДЛУ традыцыйна з'яўляецца «дзявочай» ВНУ, таму нас хвалявала тая праблема, якую ўзняла аўтар. І мы шчыра лічым, што жанчынам на вайне трэба было праяўляць яшчэ большую мужнасць, чым салдатам-мужчынам. У гэтым і заключаецца галоўная ідэя нашага ролика.

Пасля ўзнагароджання пераможцаў Юрый Чачукевіч перадаў кампакт-дыск з усімі ролікамі на захаванне ў Нацыянальную бібліятэку, а таксама паабяцаў, што ў хуткім часе будзе аб'яўлены новы конкурс буктрэйлераў.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ. *lyskavets@zviazda.by*

МЕСЦА СУСТРЭЧЫ: ДЫЯЛОГ

Аднайменная гуманітарная праграма дапамагае ахвярам нацызму ў краіне

Каля 18 мільёнаў людзей — ваеннапалонныя, вязні канцлагераў і простае грамадзянскае насельніцтва ў Германіі і на акупаваных ёй тэрыторыях былі вымушаны займацца прымусовай працай у ваеннае ліхалецце. Да нашых дзён дажыло ўжо вельмі мала сведкаў тых падзей. А людзям такога ўзросту, асабліва калі яны адзінокія, ужо цяжка самастойна весці хатнюю гаспадарку. Патрэбна ім і маральная дапамога. Ды і здароўе ўжо не найлепшае.

— Ад 2008 года ў краіне працуе гуманітарная праграма «Месца сустрэчы: дыялог», якую ініцыяваў і фінансуе нямецкі фонд «Памяць, адказнасць і будучыня». А ў Беларусі яе каардынуе Міжнароднае грамадскае аб'яднанне «Узаемаразуменне», — гаворыць **старшыня яго праўлення Анжаліка АНОШКА**. — Праграма фонду скіравана на павышэнне жыццёвага ўзроўню і ўдзелу ў грамадскім жыцці ахвяр гітлераўскага рэжыму, якія дажылі да нашых дзён. У першую чаргу яна разлічана на былых вязняў нацысцкіх канцэнтрацыйных лагераў.

Па дзяцінстве Галіны Рыбцовай, якая каардынуе адзін з праектаў праграмы ў Магілёве, ваенны каток праехаўся бязлітасна. У 1943-м яе разам з маці забралі ў лагер за тое, што бацька ваяваў супраць немцаў дзесьці на фронце. Дачка і маці прайшлі праз лагеры ў Оршы, Талачыне, а пасля трапілі ў Асвенцым. Уратаваліся толькі таму, што іх купілі, каб працавалі ў маёнтку нямецкага генерала непадалёк ад Брандэнбурга.

— У нас ёсць праграма «Пажылы пажылому», — расказвае Галіна Іванаўна. — Людзі сталага веку, сярод якіх і колішнія вязні канцлагераў, прыглядаюць за тымі, хто, на жаль, ужо самастойна весці гаспадарку не можа. Дапамагаюць нам і маладыя валанцёры. Працуюць кулінарны гурток і фіта–кавярня. Ёсць нават хор ветэранаў «Родныя напевы». І старыя людзі, якія перажылі ваеннае ліхалецце, вельмі шануюць гэтыя стасункі, дзякуючы якім яны не застаюцца сам-насам са сваімі праблемамі. Вось толькі іх становіцца ўсё менш і менш, напрыклад тых, што перацярпелі блакаду або трапілі ў ваенны палон, засталося толькі пяць чалавек...

Валяр'ян ШКЛЕННІК. *schklennik@zviazda.by*

■ Працяг тэмы

ЭКІПАЖ ЛЯЦІЦЬ У ВЕЧНАСЦЬ

У СТАРАДАРОЖСКІМ РАЁНЕ ЗНОЙДЗЕНА МЕСЦА ПАДЗЕННЯ САВЕЦКАГА САМАЛЁТА

...Яшчэ вясною я пачала пошукі збітага ў чэрвені 1941 года над лесам каля вёскі Падарэссе Старадарожскага раёна экіпажа савецкага самалёта. Гісторыя гэтая была мне знаёмая даўно, яшчэ з дзяцінства, калі я прыязджала на канікулы да сваёй бабулі — Барадзіной Агаф'і Сямёнаўны. Тады неаднаразова даводзілася слухаць аповеды мясцовых жыхароў пра збіты самалёт і знойдзены дзвюма дзяўчынкамі-падлеткамі — Трапашкай Верай і Хмелевай Матронай — планшэт з пазнакай: «Катаеў Аляксандр, станцыя Орша».

Пры падтрымцы рэдакцыі газеты «Звязда» я пачала пошукі экіпажа.

Удзел у пошуках самалёта прымалі і прафесіяналы, і звычайныя вяскоўцы, і добраахвотнікі (трэцяя злева — наш пазаштатны карэспандэнт Ларыса Карасіна).

Адразу трэба сказаць, што значную дапамогу аказалі мне Ганна Уладзіміраўна Казлоўская з вёскі Дражна, а таксама настаўніца і загадчыца музея Залужскай школы Валянціна Сямёнаўна Казлова. У выніку вялікай работы з электроннай базай «Мемарыял» і адпраўленых у Расійскую Федэрацыю (пас. Косіна Кіраўскай вобласці) запытаў, дзякуючы настаўнікам школы пасёлка Косіна і мясцовай газеце «Нива» была знойдзена сваячка лётчыка Аляксандра Васільевіча Катаева — стрыечная сястра Валянціна Зорына, якая сёння пражывае ў пасёлку Косіна. Паводле яе ўспамінаў, у бацькі Аляксандра, Васіля Аляксеевіча Катаева, які працаваў на Косінаўскай папяровай фабрыцы, было два сыны: Мікалай і прапаўшы без вестак у першыя дні вайны Аляксандр. Абодва загінулі. Валянціна Аляксееўна расказала мне, што пасля першай «пахаванкі» — на старэйшага Мікалая — бацька паступова змірыўся. А вось у гібель Сашы ніяк паверыць не мог. Не мог зразумець, як гэта самалёт мог «прапасці без вестак»? І ўвесь час чакаў...

А ў гэты ж час вясковы настаўнік з Беларусі Міхаіл Санько спрабаваў (пачынаючы з 1960-х гадоў) шукаць сваякоў Сашы Катаева і іншую інфармацыю пра яго. Але шукаў, у 99-м авіяпалку, а трэба было, як аказалася, у 140-м... (Тады, на жаль, электроннай базы «Мемарыял» яшчэ не было.) Мінула амаль 50 гадоў, перш чым я зацікавілася гэтай няскончанай гісторыяй.

Паводле ўспамінаў Валянціны Аляксееўны, бацька Сашы, пачуўшы аднойчы па радыё паведамленне, што ў адным са шпіталяў Адэсы ляжыць паранены лётчык, які страціў памяць, адразу ж напісаў у Адэсу і адправіў туды фота сына. Яму адказалі, што гэта не Аляксандр. (Жывой з усіх дзяцей Катаевых засталася толькі старэйшая сястра Анастасія. У далейшым, выйшаўшы замуж, яна з сям'ёй пераехала ў г. Брацк Іркуцкай вобласці.) Так і застаўся Саша «прапаўшым»...

Асаблівую падзяку за дапамогу ў пошуку месца падзення самалёта хачу выказаць жыхарам вёскі Падарэссе — сям'і Маслючэнкі Евы Фамінічны, яе 90-гадоваму брату Казачку Уладзіміру Фамічу (якога мы прывозілі аж з Мінска), Пінчук Фені Трафімаўне і Свірыдзе Тамары Міхайлаўне. Гэтыя людзі дапамагалі абсалютна бескарыслівa, як і многія іншыя неабыякавыя жыхары вёскі Падарэссе (Казачок Ганна Васільеўна, Сірачова Ніна Савельеўна, Колтун Адам Ігнатавіч, Карасіна Яфімія Савельеўна, Дзенісевіч Кацярына Макараўна і Дзенісевіч Адам Сяргеевіч, Свірыда Кацярына Паўлаўна, Хмелева Кацярына Харытонаўна, Замбржыцкая Людміла Сцяпанаўна, Казак Міхаіл Сямёнавіч) і вёскі Залужжа (Мельнік Таццяна Паўлаўна, Качан Мікалай Цімафеевіч, Казлоў Міхаіл Фядосавіч).

Знойдзеная дэталь ад самалёта.

У выніку нашых агульных пошукаў і работы з архіўнымі дакументамі, у тым ліку і з тымі, якія пакінуў у школьным музеі былы заслужаны настаўнік БССР Міхаіл Андрэевіч Санько, мы вызначылі імя другога лётчыка экіпажа, які ляцеў разам з Аляксандрам Катаевым. Гэта Волкаў Мікалай Іванавіч, 1914 года нараджэння, ураджэнец Маскоўскай вобласці, Нагінскага раёна, станцыі Глухава. Я адшукала яго сваякоў — дачку Вольгу Мікалаеўну Зайнебашыраву і ўнучку Ганну Барысаўну Каламеец з г. Омска. Цяпер вядзём з імі перапіску, удакладняем некаторыя звесткі.

Вялікую дапамогу аказалі мне нашы пошукавікі — гісторыкі Дзмітрый Брыштэн і Дзмітрый Кіенка, якія знайшлі афіцыйнае пацвярджэнне таго, што 27 чэрвеня 1941 года два лётчыкі — А. Катаеў і М. Волкаў — «выбылі са спісаў членаў ВКПБ». Гэта магло азначаць толькі адно: менавіта ў той дзень яны былі адпраўлены на заданне і загінулі.

Пасля я звярнулася ўжо да камандзіра бабруйскага пошукавага атрада «Абеліск» (падраздзяленне магілёўскага патрыятычнага клуба «ВІККРУ») Сяргея Аляксандравіча Поразава і папрасіла яго аб дапамозе ў ажыццяўленні сумеснага пошуку на месцы. (Сяргей Поразаў і байцы атрада «Абеліск» — вядомыя ў Беларусі прафесіянальныя пошукавікі.) У выніку праведзенай з атрадам і жыхарамі в. Падарэссе работы нам удалося вызначыць дакладнае месца падзення самалёта. А самая вялікая ўдача — на месцы раскопак знойдзена дэталь (размеркавальнік гідраўлічнай сістэмы для выпуску шасі), дзякуючы якой спецыялісты могуць вызначыць тып самалёта і ўдакладніць яго баявую «прапіску» (полк, да якога ён адносіўся). Акрамя таго, падчас работ камандзірам Сяргеем Поразавым у лясным масіве быў знойдзены снарад часоў Вялікай Айчыннай. Мы зараз жа выклікалі на месца ваенкама раёна Ігара Валачугу, які забяспечыў хуткае размініраванне.

...Рэха вайны і сёння трывожыць нашу памяць. І мы павінны вельмі беражліва адносіцца да такіх маленькіх, але каштоўных крупінак праўды, не даваць ім згубіцца ў віры «новых» павеваў. Бо вайна, як вядома, прыходзіць туды, дзе пра яе забываюцца.

А нашы пошукі працягваюцца...

Ларыса КАРАСІНА

■ На свае вочы

ПА СЛЯДАХ «БАГРАЦІЁНА»

Нататкі з падарожжа па шляху 1-га Беларускага фронту

Беларуская аперацыя «Багратыён» — адна з самых славутых падзей Вялікай Айчынная вайны. Маштабнасць (у наступленні ўдзельнічалі 2,5 мільёна савецкіх салдат, больш за пяць тысяч танкаў і столькі ж самалётаў), узровень ваеннага майстэрства (адразу шэсць удараў рассякалі фашысцкія войскі на нашай тэрыторыі) і стратэгічныя вынікі робяць яе значнай для ўсёй тагачаснай Еўропы. Пабачыць месцы, дзе пачыналася аперацыя і праходзілі знакавыя бітвы, карэспандэнты «Звязды» змаглі падчас прэс-тура для беларускіх і расійскіх журналістаў, прысвечанага 71-й гадавіне вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

У БАЛОТАХ ПАЛЕССЯ

Вёска Ракавічы Светлагорскага раёна. У чэрвені 1944 года тут, ля балота Брыцкі мох, знаходзіліся перадавыя часці 65-й арміі генерала Батава. Ісці ў наступленне салдатам давялося праз багну. Каб пусціць праз дрыгву танкі, дваццаць дзён будавалі грэблі. Аднак да месца, дзе размяшчаліся нямецкія групоўкі, драўляны насціл не даходзіў: павінен быў заставацца непрыкметным. Таму падчас наступлення салдаты ішлі наперадзе танкаў і дабудоўвалі грэблі. Дзякуючы гэтаму войскі прасоўваліся вельмі хутка: у першы дзень аперацыі да абеду паспелі прайсці восем кіламетраў (на астатніх участках фронту за гэты час пераадолелі толькі тры). Замест танкавых армій на Гомельшчыне выкарыстоўваліся карпусы. Багністая мясцовасць не дазваляла адначасова ўводзіць у бой вялікую колькасць тэхнікі.

Сёння пра падзеі тых часоў нагадвае мемарыял «Багратыён», які летась з'явіўся пад Ракавічамі. Аўтар — гомельскі скульптар Валерый Кандраценка. Побач з помнікам выкапаны імправізаваныя акопы, пакладзены грэблі. У бліндажы з часам з'явіцца экспазіцыя, прысвечаная першаму этапу наступальнай аперацыі.

— Каб стварыць паўнавартасны музей, патрэбны мінімум год, — кажа **намеснік дырэктара па навуковай працы Гомельскага абласнога музея ваеннай славы Канстанцін МІШЧАНКА.** — Фотадакументаў дастаткова. Не хапае прадметаў, на якія звычайна і прыходзяць паглядзець людзі.

Правесці вызваленчую аперацыю было цяжка. Нямецкае камандаванне лічыла становішча сваіх войскаў у Беларусі ўстойлівым. І мела для гэтага падставы. Абарона гітлераўцаў будавалася тры гады. Паводле архіўных звестак, каля 200 тысяч чалавек — мірныя жыхары Магілёўскай, Віцебскай, Калужскай, Арлоўскай і Смаленскай абласцей — рыхтавалі абарончыя рубяжы на нашай тэрыторыі. Людзей размясцілі ў працоўных лагерах прама па лініі фронту. Норма выпрацоўкі ў зімовы дзень для кожнага — траншэя даўжынёй восем метраў і глыбінёй 1,2 метра. Харчаванне — 150-300 грамаў хлеба і літр баланды. Хворых не шкадавалі: расстрэльвалі ці спальвалі на месцы.

Баі, што папярэднічалі «Багратыёну», не мелі поспеху. З 12 кастрычніка 1943-га па красавік 1944-га войскі Заходняга фронту правялі дзесяць наступальных аперацый, падчас якіх страцілі больш за 300 тысяч чалавек. Увесну надзвычайная камісія Дзяржаўнага камітэта абароны прыбыла расследаваць прычыны няўдачы. Камандуючага фронтам генерала Саварганізавалі. Новы загад — больш не дапускаць падобных памылак.

Каб дасягнуць раптоўнасці пры правядзенні аперацыі, патрэбна была якасная дэзынфармацыя. Генерал Іван Чарняхоўскі пачаў пазначаць драўлянымі макетамі падманныя месцы канцэнтрацыі войскаў у тых раёнах, дзе сапраўды прадугледжвалася размяшчэнне групоўкі для наступлення. Праціўнік на хітрыкі павёўся: некалькі разоў у макеты ляцелі драўляныя нямецкія бомбы. Думка пра тое, што савецкія войскі рыхтуюць наступленне менавіта адсюль, у фашыстаў не магла ўзнікнуць. Франтавыя газеты публікавалі матэрыялы толькі па абарончай тэматыцы, а асобным савецкім злучэнням было загадана стварыць не менш за тры абарончыя рубяжы ў глыбіню да 40 кіламетраў. Пра тое, што немцы палічылі гэтую аперацыю падманным манеўрам, сведчыць і бюлетэнь ацэнак праціўніка на ўсходнім фронце за 13 чэрвеня 1944 года. «Савецкае наступленне, якое рыхтуецца на поўнач ад прыпяцкіх балот, мае на мэце ўвесці ў зман германскае камандаванне адносна напрамку галоўнага ўдару і адцягнуць рэзервы немцаў з раёна між Карпатамі і Ковелем», — пісалася ў бюлетэні.

Беларуская аперацыя, план якой быў зацверджаны 20 мая 1944 года, шмат у чым стала наватарскай. Рашэнне нанесці адначасова два галоўныя ўдары ішло насуперак прынятым поглядам. Маршал Канстанцін Ракасоўскі ў сваіх мемуарах піша: «Мы ішлі на вядомае распыленне сіл, але ў балотах Палесся другога выйсця не было. Мясцовасць у напрамку ўдару з боку Рагачова дазваляла сканцэнтраваць там у пачатку наступленне рэзервы толькі 3-й і часткова 48-й армій. Калі б гэтай групоўцы не дапамаглі атакай на іншым участку, праціўнік мог бы перакінуць сюды астатнія сілы і прадухіліць прарыў савецкіх войскаў». Два галоўныя ўдары давалі шанц дамагчыся поспеху хаця б на адным з напрамкаў.

Упершыню за Вялікую Айчынную вайну Стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандуючага азнаёміла камандзіраў франтоў з задумай усёй стратэгічнай аперацыі. На думку Ракасоўскага, гэта быў вялікі плюс: ведаючы агульную ідэю, кіраўніцтва магло лепш зразумець задачу сваіх войскаў.

ШКОЛЬНЫЯ КЛАСЫ БЕЗ ВУЧНЯЎ

Вёска Чырвоны Бераг Жлобінскага раёна. У спякотны летні дзень тут надзвычай прыгожа і спакойна. А ў гады Вялікай Айчыннай вайны на месцы зялёнага яблыневага саду знаходзіўся самы буйны ў Беларусі дзіцячы донарскі канцлагер. У Чырвоным Беразе 1990 малых сталі донарамі для параненых фашысцкіх салдат. У хлопчыкаў і дзяўчынак ва ўзросце ад 8 да 14 гадоў з першай групай крыві (рэзус фактар станоўчы) яе забіралі цалкам. Саміх дзяцей было загадана знішчаць. Месцы іх пахавання дагэтуль не вядомы. Па ўспамінах Паўла Ткачова, які падлеткам працаваў тут у ваенным шпіталі і хаваў нямецкіх салдат, што паміралі на бальнічных ложках, целы дзяцей укладвалі ў мяшкі і апускалі на першы паверх. З кацельні непадалёк пастаянна ішоў чорны з'едлівы дым: магчыма, там спальвалі маленькіх донараў.

Напрыканцы вайны сталі браць і іншыя групы крыві. Па пэўных днях месяца мясцовых дзяцей ганялі ў ваенны шпіталь. Хто з дзяцей стане заўтра донарам, маглі вызначыць ужо ўвечары: «абраным» малым давалі выпіць шмат падкісленай вадкасці, каб зрабіць кроў менш густой.

Ваенная экспазіцыя ў Бабруйскім краязнаўчым музеі.

Мемарыял у вёсцы Чырвоны Бераг, пабудаваны па плане архітэктара Леаніда Левіна ў 2007 годзе (з гэтага часу комплекс наведалі больш за 1 мільён 250 тысяч чалавек), называюць «Дзіцячай Хатынню». Толькі на тэрыторыі нашай краіны ў гады вайны фашысты стварылі 16 дзіцячых канцлагераў, з іх пяць — донарскія. Усяго за часы Другой сусветнай вайны ў Еўропе загінула больш за 14 мільёнаў хлопцаў і дзяўчат.

«Мёртвы клас» — цэнтральная частка мемарыяла. Дваццаць адна белая парта, за якія ніколі не сядуць вучні. Яшчэ ў маі 1941 года, перад нападам на Савецкі Саюз, Гітлер выдае загад: пасля захопу беларускай зямлі для дзяцей-рабоў дастаткова ведаць правілы дарожнага руху, навучыцца лічыць да ста, авалодаць сельскагаспадарчымі працамі і ўмець ставіць асабісты подпіс. За ваенны перыяд у нашай краіне было знішчана 8,8 тысячы школ. На пачатак 1947-га ўдалося аднавіць толькі чвэрць з іх.

Генерал Іван Чарняхоўскі пачаў пазначаць драўлянымі макетамі падманныя месцы канцэнтрацыі войскаў у тых раёнах, дзе сапраўды прадугледжвалася размясціць групоўкі для наступлення. Праціўнік на хітрыкі павёўся: некалькі разоў у макеты ляцелі драўляныя нямецкія бомбы.

За мёртвым класам і макетам карты Беларусі, дзе пазначаны месцы дзеяння ўсіх дзіцячых канцлагераў, створаных гітлераўцамі, — Плошча Сонца. У цэнтры стаіць Караблік Надзеі, на ветразях якога напісана 171 дзіцячае імя. Кажуць, што ў дзень вызвалення Чырвонага Берага гэтых малых, якіх немцы збіраліся перасылаць у іншыя канцлагеры, удалося выратаваць. Светлую плошчу ўпрыгожваюць 24 каляровыя вітражы. Эскізамі для іх сталі дзіцячыя малюнкі. Мастак Сяргей Каткоў пасля вызвалення Мінска хадзіў па руінах горада і збіраў малечу, якая ўмела маляваць. Ён папрасіў дзяцей адлюстраваць тое, што яны хацелі б убачыць адразу пасля вайны. Цырк, свойскія жывёлы, сям'я — аб гэтым марылі падлеткі, дзяцінства якіх адабрала вайна. Скульптуры звяркоў і птушак — таксама творы школьнікаў. За паўгода да здачы мемарыяла ў Жлобінскім доме-інтэрнаце правялі конкурс лепкі і найлепшыя работы, у павялічаным маштабе, адлілі ў метале.

Тут, ля вёскі Ракавічы, пачыналася славутая беларуская аперацыя.

Фота Надзеі БУЖАН

Караблік Надзеі з імёнамі маленькіх донараў, якіх удалося выратаваць.

Пра ўражанні ад прэс-тура мы спыталіся ў расійскіх калег.

Армэн ГАСПАРАН, кіраўнік упраўлення па ўзаемадзеянні СМІ блізкага замежжа міжнароднага інфармацыйнага агенцтва «Россия сегодня», член Цэнтральнага савета Расійскага ваенна-гістарычнага таварыства:

— Мы ў Маскве горка жартавалі ў красавіку, што яшчэ 5-10 гадоў — і мы адны будзем адзначаць гадавіну Перамогі над нацызмам. Таму было вельмі прыемна, што ў Беларусі памятаюць пра тыя падзеі, не спрабуюць пераглядзець сваё мінулае. У кнігарнях шмат выдадзенай у апошнія гады літаратуры, прысвечанай Перамозе. Мы ўбачылі ў ідэальным парадку помнікі, музейныя экспазіцыі, якія пастаянна абнаўляюцца. Гэта мае пэўныя нацыянальныя каларытныя рысы. Добра, што памяць пра ваенныя гады захоўваецца, дай Бог, каб так было і далей.

Арыядна РАКАСОЎСКАЯ, аглядальнік «Российской газеты», праўнучка маршала Канстанціна Ракасоўскага:

*— Маршрут, па якім мы праехалі, для мяне не чужы, таму што мой прадзед быў адным з аўтараў і выканаўцаў «Багратыёна» і Гомельска-Рэчыцкай аперацыі. Убачыць самой усё тое, пра што я шмат разоў чула, чытала, заўсёды марыла ўявіць, — унікальны досвед. У Гомелі (там для журналістаў праходзіў круглы стол. — **Аўт.**) , дарэчы, мае бабуля і прабабуля разам з прадзедам сустракалі новы 1944 год. Таму ў мяне гэтыя мясціны выклікаюць шмат асабістых эмоцый.*

ПОДЗВІГ ДЗЕЛЯ ТАВАРЫШАЎ

Бабруйск. У 2009-м горад узнагародзілі вымпелам «За мужнасць і стойкасць у гады Вялікай Айчыннай вайны». 71 год таму савецкія войскі правялі тут Бабруйскую наступальную аперацыю, якая доўжылася шэсць дзён. Тады ў катле апынуліся 50 тысяч немцаў: пяць дывізій і гарнізон. 107 тысяч чалавек — столькі палонных і забітых салдат страцілі фашысты пад Бабруйскам. Менавіта падчас гэтай аперацыі, 26 чэрвеня, Канстанцін Ракасоўскі атрымаў званне маршала. Героя Савецкага Саюза за бабруйскае наступленне прысвоілі 81 чалавеку. Іх імёны ўвекавечаны ў «саркафагу памяці», што стаіць у адной з залаў мясцовага краязнаўчага музея. У ім жа ляжаць шыльды са спісамі тых, хто загінуў і прапаў без вестак.

Апошнім прыпынкам нашай дэлегацыі стаў Курган Славы ў вёсцы Сычкава. На алеі, што вядзе да кургана, 13 стэл, на якіх запісаны імёны Герояў Савецкага Саюза — бабруйчан і савецкіх салдат з іншых рэгіёнаў, што здзейснілі свой подзвіг на Бабруйшчыне. Для аднаго са згаданых герояў, Міхаіла Селязнёва, ураджэнца Новасібірскай вобласці, бой у вёсцы Сычкава стаў апошнім. 30 чэрвеня 1944-га камандзір стралковага аддзялення атрымаў заданне — ліквідаваць нямецкі дзот. Селязнёў наблізіўся да кулямёта і паспрабаваў спыніць яго некалькімі аўтаматнымі чэргамі. Безвынікова. Гранат у сяржанта не заставалася. Каб прымусіць кулямёт замоўкнуць, Селязнёў закрыў амбразуру сваім целам. За гады вайны падобны подзвіг здзейснілі 437 грамадзян саюза (немцы, дарэчы, ведалі, што савецкія салдаты здольныя на гэта, таму трымалі ў дзотах доўгія шасты, каб скідваць целы). Зусім юнакі — большасці з іх было 20-25 гадоў — рабілі гэта не для таго, каб уваісці радком у гісторыю, а дзеля сваіх таварышаў. У баі нават адна хвіліна можа змяніць сітуацыю. Коштам аднаго жыцця ратавалі дзясяткі, часам сотні чалавек.

Пры будаўніцтве ў курган заклалі 70 колбаў з зямлёй з 70 брацкіх магіл, якія знаходзяцца на тэрыторыі Бабруйскага раёна. Колькі іх па ўсёй Беларусі, вядомых і пакуль не знойдзеных, падлічыць немагчыма. У памяць аб тых, хто загінуў у гады Вялікай Айчыннай вайны, дэлегацыя расійскіх і беларускіх журналістаў усклала кветкі да падножжа кургана. Як знак удзячнасці і бязмернай павагі да людзей, якія аддалі жыццё за нашу будучыню і сваімі подзвігамі заслужылі права назаўсёды застацца ў беларускай гісторыі.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
lubneuskaya@zviazda.by

В **суд Октябрьского района г. Витебска** поступило заявление о признании безвестно отсутствующей ШЕРИКОВОЙ Инны Аркадьевны, 21.08.1972 г. р., уроженки г. Витебска. Последнее место жительства: Российская Федерация, Ленинградская обл., г. Кингисепп, ул. Железнодорожная, д. 7, кв. 75.

Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам, имеющим какие-либо сведения о Шериковой Инне Аркадьевне, сообщить об этом в двухмесячный срок с момента публикации данного сообщения в суд Октябрьского района г. Витебска по адресу: ул. «Правды», д. 34, каб. 2.4 или 2.6, г. Витебск, тел. 8 (0212) 47 71 13.

Страховой полис по добровольному страхованию от болезней и несчастных случаев на время поездки за границу (Балтассистанс) серии БА № 0399271 страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» **считать недействительным в связи с утерей.**

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

СТРОИТЕЛЬСТВА ОБЪЕКТА

«Комплекс многоквартирных жилых домов со встроенно-пристроенными помещениями общественного назначения и подземной гараж-стоянкой в границах улиц Кольцова, Восточной, переулка 4-го Полиграфического в г. Минске. Жилой дом №1 по генплану»

Сведения о застройщике:

Общество с ограниченной ответственностью «Фрелиэйсэксим» (ООО «Фрелиэйсэксим»)

Местонахождение: г. Минск, ул. Лобанка, д. 79 офис 22 (р-н Сухарево), юр. адрес: Минский р-н, д. Валерьяново, ул. Нижняя Луговая, д. 4а, к. 1п, тел. (8 017) 391 21 00.

Режим работы: рабочие дни – с понедельника по пятницу; рабочие часы – понедельник – четверг с 9.00 по 18.00; пятница с 9.00 по 16.45; обед – с 13.00 по 14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

Данные о государственной регистрации: зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 101517886.

Сведения о проектах жилых домов: В проектах строительства жилых домов и иных объектов недвижимости в течение трех лет, предшествующих опубликованию проектной декларации, ООО «Фрелиэйсэксим», участие не принимало.

Цель проекта – строительство 25-этажного, односекционного, 192-квартирного каркасно-блочного жилого дома № 1 по генплану в составе Объекта: «Комплекс многоквартирных жилых домов со встроенно-пристроенными помещениями общественного назначения и подземной гараж-стоянкой в границах ул. Кольцова, Восточной, пер. 4-го Полиграфического».

Сведения об этапах и сроках реализации – начало реализации – 25 апреля 2013 г. Нормативный срок строительства 24.5 месяца. Завершение строительства – 1-й квартал 2016 г.

У Застройщика имеются:

- решения Мингорисполкома №3796 от 13.12.2012 г., предоставляющее право на строительство объекта «Комплекс многоквартирных жилых домов со встроенно-пристроенными помещениями общественного назначения и подземной гараж-стоянкой в границах ул. Кольцова, Восточной, пер. 4-го Полиграфического в г. Минске. Жилой дом № 1 по генплану», №1350 от 29.05.2014 г., предоставляющее право на строительство инженерных сетей Объекта, №504 от 05.03.2015, продлевающего сроки строительства;

- проектно-сметная документация, прошедшая в установленном порядке государственную экспертизу в РУП «Главгосстройэкспертиза» (заключение от 13.01.2012. №1125-15/11 по объекту «Комплекс многоквартирных жилых домов со встроенно-пристроенными помещениями общественного назначения и подземной гараж-стоянкой в границах ул. Кольцова, Восточной, пер. 4-го Полиграфического в г. Минске. Жилой дом № 1 по генплану» и от 31.07.2013 № 601-15/13 по объекту «Комплекс многоквартирных жилых домов со встроенно-пристроенными помещениями общественного назначения и подземной гараж-стоянкой в границах ул. Кольцова, Восточной, пер. 4-го Полиграфического в г. Минске (Жилой дом № 1 по генплану – инженерные сети»);

- разрешение на производство строительно-монтажных работ № 2-207Ж-015/13 от 25.04.2013 до 31.07.2013, 26.07.2013 до 23.08.2013, 03.09.2013 до 25.09.2014, 20.02.2014 до 01.12.2014; 06.02.2014 до 31.12.2015.

- договор строительного подряда с ООО «ЛайтСтарТелеком» № 26.08/С/2013 от 26.08.2013 г.;

Местонахождение строящегося объекта: г. Минск, в границах ул. Кольцова, Восточной, пер. 4-го Полиграфического.

Площадь земельного участка: 1.0364 га

Цена одного квадратного метра общей площади жилых помещений составляет сумму в белорусских рублях эквивалентную 1 150 долларам США. Подлежащая оплате сумма определяется по официальному курсу белорусского рубля к доллару США, установленному Национальным Банком Республики Беларусь на день платежа.

Количество предлагаемых объектов для заключения договоров создания объектов долевого строительства – 30 единиц

1-комнатные квартиры – 10 единиц

2-комнатные квартиры – 10 единиц

3-комнатные квартиры – 10 единиц

Условия оплаты: Оплата цены объекта долевого строительства производится дольщиком единовременно либо поэтапно в установленный договором период по графику платежей. По соглашению сторон дольщику может быть предоставлена скидка от общей стоимости квартиры.

Условия возможного изменения цены строительства застройщиком в одностороннем порядке: изменение цены объекта долевого строительства (цены договора) допускается по соглашению сторон, в том числе по соглашению сторон об изменении проектной документации в отношении финансируемого дольщиком объекта долевого строительства, по ходатайству дольщика об отказе от оказания отдельных услуг, выполнения отдельных работ или об оказании дополнительных услуг, выполнении дополнительных работ, изменение площади жилого помещения по результатам инвентаризации, проводимой в установленном порядке.

Информация о решении местного исполнительного и распорядительного органа о процентном соотношении в строящемся объекте граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий: привлечь 40% дольщиков из числа граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, согласно решению Минского городского исполнительного комитета №3796 от 13.12.2012 г.

Характеристики объекта:

25-этажный жилой дом на 192 квартиры (48 шт. – 1-комнатных, 96 шт. – 2-комнатных, 48 шт. – 3-комнатных) запроектирован в монолитном железобетонном каркасе с ограждающими конструкциями из блоков ячеистого бетона. На первом этаже размещаются встроенные помещения – торговые и офисные, а также вход в жилую часть дома. В техподполье размещаются инженерные помещения и коммуникации. Над жилыми этажами предусмотрено устройство теплого чердака. Высота жилых этажей 3 м от пола до пола.

В качестве наружной отделки стен (до 4-го этажа включительно) используется вентилируемая навесная фасадная система из керамогранитных плит. Цокольный этаж облицован декоративными плитами типа «Бессер». Стены выше 4-го этажа оштукатуриваются, грунтуются, и окрашиваются акриловой краской.

Остекление – окна из поливинилхлоридного профиля с расчетным сопротивлением теплопередаче не менее 1,0 м^2 С/Вт.

Здание оборудовано тремя пассажирскими лифтами грузоподъемностью 400 кг, а также двумя грузопассажирскими лифтами грузоподъемностью 630 кг, один из этих лифтов выполнен противопожарным.

Для маломобильных групп населения предусмотрено устройство пандусов для подъема в помещения общественного назначения. При входах в жилую часть здания предусмотрены места возможного устройства пандусов.

Количество в строящихся жилых домах и иных объектах недвижимости самостоятельных частей, передаваемых застройщиком дольщикам после ввода жилого дома в эксплуатацию:

Общее количество квартир – 192 ед., в том числе:

однокомнатных квартир – 48 (общая площадь от 50,72 кв.м до 51,92 кв.м);

двухкомнатных квартир – 96 (общая площадь от 63,12 кв.м до 71,76 кв.м);

трёхкомнатных квартир – 48 (общая площадь от 86,95 кв.м до 87,74 кв.м)

Элементы благоустройства: В соответствии с архитектурно-планировочным решением генерального плана, в центре участков застройки сформированы дворовые пространства, закрытые от улиц Кольцова, Восточной.

С целью создания комфортной среды предусматривается комплексное благоустройство дворовых территорий, в составе которых запроектированы площадки для отдыха взрослого населения, детские игровые и физкультурные площадки, площадки для хозяйственных целей и крупногабаритного мусора.

Все расположенные на проектируемой территории площадки оборудованы в соответствии с их функциональным назначением малыми архитектурными формами

В общую систему проездов включены открытые парковки, размещаемые на обособленных площадках.

Для покрытия проездов и парковок используется асфальтобетонная смесь, тротуаров, площадок и пешеходных дорожек – мелкозернистая бетонная тротуарная плитка, площадок для отдыха и детских игровых площадок – мягкие дорожные одежды.

Мероприятия по организации безбарьерной среды для физически ослабленных лиц и инвалидов включают: прокладку пешеходных маршрутов с устройством доступных подходов к площадкам и местам посадки в общественный транспорт; организацию гостевых парковок для спецтранспорта инвалидов с установкой соответствующих информационно-указательных знаков; устройство пониженного борта в местах пешеходных переходов дублирование наружных лестниц пандусами.

Озеленение территории предусматривается на основе архитектурно-планировочного решения генплана за счет посадки декоративных деревьев и кустарников в дополнение к существующим сохраняемым зеленым насаждениям, а также устройства цветников и газонов на свободных от покрытий территориях.

Общее имущество дольщиков – межквартирные лестничные клетки, лестницы, коридоры, крыша, техподполье, несущие, ограждающие конструкции, оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых помещений, элементы благоустройства и озеленения.

Функциональное назначение нежилых помещений: на первом этаже запроектированы помещения товарищества собственников.

Предполагаемый срок ввода дома в эксплуатацию – 2-й квартал 2016 г.

Условия ознакомления с информацией по проекту:

Ознакомиться с объектом долевого строительства и ходом работ по его строительству можно в офисе уполномоченного представителя застройщика:

Уполномоченный риэлтер – ЧРУП «Вива Консалт» (торговая марка ViVa Invest)

УНП 191187048 г. Минск, ул. Марьевская, д. 5а, офис 11. Время работы: Понедельник – пятница с 9.00 до 18.00 или на сайте www.delfin.by

Телефоны: (8-017) 391-21-00, (+375 17) 288-27-08, (+375 29) 1-907-901 (мобильный), (+375 29) 1-907-906 (мобильный).

Эл. почта: info@vivainvest.by

70 гадоў 1945-2015 Вялікай Перамогі

ЗАЛА № 5. «Карэнны пералом у ходзе вайны. Савецкі тыл»

Працягваем віртуальнае падарожжа па Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны

Поспехі савецкіх войскаў пад Сталінградам, Курскам і на Дняпры прадвызначылі далейшы ход не толькі Вялікай Айчыннай, а і Другой сусветнай войнаў. Гэта былі нябачаныя паражэнні гітлераўцаў. Страціўшы велізарную армію і магутную баявую тэхніку, яны былі асуджаны на правал. Чырвоная Армія перайшла ў контрнаступленне.

ФРАНТАВЫ ДРУК

Франтавы друк, якому прысвечаны адзін з раздзелаў экспазіцыі, адлюстроўваў баявы вопыт чырвонаармейцаў, дапамагаў ім авалодаць ваеннай тэхнікай, мабілізоўваў народ на знішчэнне ворага. У падпольных рэдакцыях працавалі многія вядомыя пісьменнікі: Міхась Лынькоў, Максім Танк, Пімен Панчанка, Пятрусь Броўка, Анатоль Куляшоў і іншыя. У музеі захоўваецца вышытая сурвэтка з надпісам «Папочке от Люды», якую ў падарунак ад дачкі атрымаў супрацоўнік франтавой газеты «За Совецкую Беларусь» Кандрат Крапіва. На фотаздымках — знакамітыя франтавыя карэспандэнты, наборшчыцы, салдаты, якія з цікавасцю чытаюць свежы нумар газеты. Напэўна, адну з яе публікацый набіраў на сваёй друкавальнай машынцы, якая прадстаўлена ў экспазіцыі, і літаратурны супрацоўнік рэдакцыі газеты «Красное Знамя» малодшы лейтэнант Пётр Пятровіч.

Дыван з партрэтам камандуючага Данскім фронтам генерал-лейтэнанта Ракасоўскага ў 1974 годзе перадала ў музей сям'я славутага военачальніка.

У военным друку адлюстроўваліся і дыпламатычныя адносіны з саюзнікамі. У музеі можна ўбачыць некаторыя рэчы, якія Савецкі Саюз атрымліваў са Злучаных Штатаў Амерыкі па ленд-лізе: пісталеты-кулямёты Томпсана і Рэйзінга, лекі, біноклі, сумкі, вопратку... Закон аб ленд-лізе быў прыняты 11 сакавіка 1941 года Кангрэсам ЗША. Ён прадугледжваў перадачу ў пазыку, арэнду або іншым спосабам ваенных матэрыялаў і тавараў, неабходных для абароны дзяржаў антыгітлераўскай кааліцыі. У Савецкі Саюз дапамога пастаўлялася па трох шляхах. Найбольш бяспечнымі і доўгімі былі пастаўкі праз Уладзівасток і Іран. Самымі хуткімі, але не вельмі надзейнымі — праз Мурманск.

Чалавекам, які меў непасрэднае дачыненне да гэтых паставак, быў ураджэнец Быхаўскага раёна Магілёўскай вобласці Канстанцін Лукашоў. З 1942 года ён з'яўляўся намеснікам старшыні Савецкай урадавай закупачнай камісіі па ленд-лізе ў Вашынгтоне. У вітрыне — фрак Лукашова, медыкаменты амерыканскай вытворчасці, прывезеныя яго сям'ёй з ЗША. Тут жа і яго пасведчанне акадэміка Акадэміі навук БССР. Многія гады прафесар Лукашоў працаваў на навуковай ніве: быў рэктарам Белдзяржуніверсітэта імя Леніна, дырэктарам інстытута геахіміі і геафізікі АН БССР.

Каб зберагчы народнае дабро ад вайны, з Веткі, што на Гомельшчыне, у Саратаўскую вобласць была ажыццёўлена эвакуацыя кароў, авечак і коней. На працягу пяці месяцаў па тысячакіламетровым шляху, які пралягаў праз пяць абласцей, статак з 700 галоў гналі ўсяго некалькі падлеткаў і жанчын. Пра подзвіг гэтых людзей і падрабязнасці эвакуацыі, якую ўзначаліла Пелагея Барадзіна, мы расказвалі раней (нумар за 20 чэрвеня 2015 года).

«ШКОЛА ВУЛІЧНЫХ БАЁЎ» І ДЫВАН РАКАСОЎСКАГА

Летам 1942 года ў данскіх і прыволжскіх стэпах разгарнулася Сталінградская бітва. Адна з найбуйнейшых і вырашаючых падзей Вялікай Айчыннай вайны доўжылася 200 дзён і начэй. Нямала беларусаў загінула пад Сталінградам. Апошнім прытулкам горад на Волзе стаў і для дырэктара Ульскай школы Бешанковіцкага раёна Уладзіміра Яцкевіча. Яго кашулю — з вышытым арнаментам — у музей перадаў сын Уладзімір. Ён неаднойчы ездзіў на месца, дзе загінуў бацька. Адтуль, дарэчы, прывёз экспанаты, змешчаныя ў інсталяцыі музея «Баі ў горадзе».

У баях на подступах да Сталінграда дапамагаў параненым вайскоўцам санінструктар Іван Нікіценка. 24 ліпеня 1942 года гамяльчанін быў паранены. Варожая куля прабіла камсамольскі білет, які захоўваўся ў нагрудней кішэні. Нягледзячы на цяжкае раненне, старшы лейтэнант удзельнічаў у вызваленні Беларусі і дайшоў да Берліна. У экспазіцыі можна ўбачыць і шлемафон Героя Савецкага Саюза гвардыі капітана Антона Аляхновіча, які ў баях за Сталінград здзейсніў 186 баявых вылетаў. Ён стаў адзіным лётчыкам авіяцыі далёкага дзеяння, які за ўсю вайну пралятаў на адным і тым жа бамбардзіроўшчыку «Іл-4», ды яшчэ з тым жа экіпажам.

Сталінград называюць «школай вулічных баёў». І невыпадкова. У верасні 1942 года, калі вораг пачаў штурм горада, баі вяліся за кожную вуліцу, за кожны дом. Менавіта ў Сталінградзе былі сфарміраваны штурмавыя групы, якія вялі вулічныя баі. Уявіць абмундзіраванне байца падраздзялення дапамагаюць такія экспанаты, як пісталет-кулямёт Шпагіна, ранцавы агнямёт «РОКС-3», стальны нагрудник «СН-42», гранаты «РГД-33» і «Ф-1», нож, сапёрныя лапатка і нажніцы, плашч-накідка.

Асколак, які прабіў фотаздымак, стаў смяротным для лейтэнанта Фёдара Падсадніка.

Можна ўбачыць фотаздымак будынка ўнівермага на плошчы Палеглых змагароў, у склепе якога размяшчаўся і быў узяты ў палон штаб 6-й арміі на чале з генерал-фельдмаршалам Паўлюсам. 31 студзеня 1943 года дэлегацыю па прыёме капітуляцыі ўзначаліў начальнік штаба 64-й арміі Сталінградскага фронту генерал-маёр Іван Ласкін. У музеі прадстаўлены ўзнагародны комплекс Івана Андрэевіча, у тым ліку і ордэн Чырвонага Сцяга, якім ён быў узнагароджаны за абарону Сталінграда. Немалая заслуга ва ўзяцці ў палон буйнога нямецкага военачальніка і вядомага палкаводца Канстанціна Ракасоўскага. Як напамін — падарунак, які за разгром групоўкі праціўніка пад Сталінградам Канстанціну Канстанцінавічу паднеслі туркменскія ткачыхі. Дыван з партрэтам камандуючага Данскім фронтам генерал-лейтэнанта Ракасоўскага ў 1974 годзе перадала ў музей сям'я славутага военачальніка.

Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

ГЕРОІ КУРСКА

Арыгінальна прадстаўлена тэма бітвы пад Курскам. Ты быццам знаходзішся ў акопе, з якога назіраеш за тым, што адбываецца навокал — такім чынам становішся ўдзельнікам падзей на Курскай дузе. Эфект прысутнасці дапамагаюць стварыць кадры з кінаэпапеі Юрыя Озерава «Вызваленне».

З фотаздымкаў, змешчаных побач, на нас глядзяць удзельнікі бітвы. Напрыклад, батарэя пад камандаваннем Данііла Чмараткова ў баі 5 ліпеня 1943 года адбіла 6 атак праціўніка, знішчыла «тыгр» і тры «фердынанды». У крытычны момант бою камбат выклікаў агонь на сябе. Быў цяжка паранены, пазбавіўся нагі. Пагоны, планшэт і блакнот нагадваюць пра подзвіг Чмараткова. Побач — артылерыйскія прыборы і бранзалет ад наручнага гадзінніка, пашкоджанага куляй. Рэчы належалі камандзіру батарэі, Герою Савецкага Саюза Аляксандру Барданаву. У баях пад Белгарадам 7 жніўня 1943 года ён знішчыў 15 танкаў і 10 бронемашын праціўніка. Праз некалькі дзён воіны яго батарэі каля горада Ахтырка Сумскай вобласці падбілі пяць танкаў. Аляксандр Барданаў быў цяжка паранены, але застаўся ў страі да канца бою.

Прыцягвае ўвагу наведвальнікаў рэдкі фотаздымак. На ім — сляды смерці. Асколак, які прабіў фота 16 ліпеня 1943 года ў баях у вёсцы Сетуха Арлоўскай вобласці, смяротна параніў палітрука палка 124-й стралковай дывізіі, ураджэнца Віцебскай вобласці. Перад адыходам на фронт Фёдар Падсаднік сфатаграфаваўся разам з сястрой Марыяй.

6 ліпеня, на другі дзень бітвы пад Курскам, у бой з 20 варожымі самалётамі ўступіў беларускі лётчык Аляксандр Гаравец. Падбіўшы дзевяць з іх, ён загінуў. Пасмяротна Аляксандру Канстанцінавічу было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Месца яго гібелі ўстанавілі праз 14 гадоў пасля вайны. У 1957 годзе астанкі героя пахаваны ў вёсцы Зорынскія Двары Іўнянскага раёна Белгарадскай вобласці.

АБАРОНА ЛЕНІНГРАДА

Амаль 900 доўгіх дзён і начэй доўжылася блакада Ленінграда. Гэта самая працяглая і страшная аблога горада за ўсю гісторыю чалавецтва. Ва ўсёй сусветнай гісторыі няма ёй роўных і па колькасці ахвяр: каля мільёна чалавек не вынеслі голаду і холаду, абстрэлаў і бамбёжак. Аднак горад выстаяў. Калі б Ленінград здаўся, то быў бы сцёрты з твару зямлі.

Банк не позднее одного рабочего дня до даты начала размещения Облигаций представляет информацию о величине дохода по Облигациям Регистрирующему органу, а также публикует соответствующее сообщение в газете «Звязда» и на официальном интернет-сайте Банка (http://belarusbank.by).

Доход выплачивается на основании реестра владельцев Облигаций соответствующего выпуска (далее – реестр) для целей выплаты дохода, сформированного депозитарием Банка, путем перечисления в безналичном порядке в соответствии с законодательством Республики Беларусь причитающихся денежных средств в белорусских рублях на счета владельцев Облигаций, являющихся таковыми по состоянию на дату формирования реестра. Даты формирования реестра, а также порядок определения таких дат, в случае если установленная дата выпадает на нерабочий день, указаны в пункте 18 настоящего документа.

17. Период начисления дохода по облигации

Период начисления дохода по Облигации – с 07.07.2015 по 06.01.2018 (с даты, следующей за датой начала размещения Облигации, по дату начала погашения Облигации) включительно.

Доход за первый период начисляется с даты, следующей за датой начала размещения Облигации, по дату его выплаты включительно. Доход по остальным периодам, включая последний, начисляется с даты, следующей за датой выплаты дохода за предшествующий период, по дату выплаты дохода за соответствующий период начисления дохода (в последнем периоде – по дату начала погашения) включительно.

18. Даты выплаты дохода. Даты формирования реестра владельцев облигаций для целей выплаты дохода

Доход по Облигации выплачивается в дату окончания соответствующего периода начисления дохода в соответствии со следующим графиком:

| ПЕРИОД НАЧИСЛЕНИЯ ДОХОДА | | | | Дата формирования реестра владельцев Облигаций для целей выпл

Краіна здароўя

Выпуск № 12 (342)

■ Асаблівасці харчавання

ВАМ ГЭТА НЕЛЬГА!

Пры самых розных захворваннях страўнікава-кішачнага тракта нельга «траўмаваць» слізістую, правакаваць непрыемныя сімптомы. Дацэнт 2-й кафедры ўнутраных захворванняў Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, кандыдат медыцынскіх навук Мікалай КАПРАЛАЎ нагадвае, пра што трэба памятаць такім хворым у першую чаргу.

1. Не ўжываць прадукты, якія валодаюць моцным сакагонным дзеяннем або механічна раздражняюць слізістую.

2. Не пераядаць.

3. Харчаванне павінна быць дробным, праз кожныя 3-4 гадзіны (усяго 6 разоў за суткі).

4. Не ўжываць надта халоднае і надта гарачае.

5. Абмяжоўваць соль.

6. Апошні прыём ежы — шклянка цёплага малака (калі няма непераноснасці цэльнага малака).

ЗАБАРАНЯЕЦЦА:

тлустыя мяса і рыба, смажаныя мяса і рыба; сырая, непрацёртая раслінная клятчатка; салёныя і вострыя стравы, у тым ліку каўбасы і кансервы; здоба, пірагі, чорны хлеб; вельмі халодныя напоі; алкаголь.

ДАЗВАЛЯЕЦЦА:

хлеб белы пшанічны, учарашні або падсушаны; суп малочны з круп, з дробнымі макаронамі, локшынай; яйкі ўсмятку, паравы амлет; малако, вяршкі, свежая някіслая смятана і тварог; мяса/птушка нятлустыя, прыгатаваныя на пары або адвараныя; нятлустыя гатункі адвараній і на пары рыбы; бульба, морква, буракі, гарбуз у выглядзе пюрэ, паравыя пудынгі; крупы, макароны, вараныя на вадзе, з дабаўленнем малака; сметанковае масла, алей, ягады салодкія вараныя, працёртыя.

І некалькі рэкамендацый па харчаванні пры наяўнасці той ці іншай паталогіі.

Гастраэзафагеяльная рэфлюксная хвароба

Варта нагадаць, што гэта захворванне стрававода. У ніжнім яго аддзеле ёсць клапан, які не дазваляе кісламу змесціву страўніка трапляць у страваход, які не мае абароны ад кіслаты. Калі клапан не закрываецца цалкам, слізістая страваводa пашкоджваецца і гэта пашкоджанне прыводзіць да вышэйзгаданай хваробы са складаным назвай. Асноўны яе сімптом — пякотка, якая можа з'яўляцца або ўзмацняцца, калі вы падымаеце цяжар, пераядаеце, носіце цеснае адзенне, прымаеце гарызантальнае становішча адразу пасля ежы. Лекавая тэрапія абавязкова ўключае камбінацыю прэпаратаў, прызначаную ўрачом. Асабістыя рэкамендацыі па дыеце можа зрабіць толькі ўрач, а ўвогуле трэба імкнуцца не есці як мінімум за 2 гадзіны да сну і перад працай, якая патрабуе нахілу тулава, не курыць.

ЗАБАРАНЯЕЦЦА:

грыбныя, мясныя, рыбныя, наварыстыя вегетарыянскія булёны (боршч, капуста, халаднік); тлустае мяса і рыба; смажаныя, вэнджаныя мяса і рыба; нерафінаваны алей, сала і маргарын; сырая непрацёртая раслінная клятчатка; салёная марынаваная гародніна, грыбы, таматы, белакачанная капуста, рэдзька, шчаўе, цыбуля, часнок; кіслыя і багатыя на клятчатку фрукты і ягады; салёнае, вострае; свежая здоба і чорны хлеб; малочныя прадукты з высокай кіслотнасцю; проса, ячневая і кукурузная крупы, бабовыя, макароны; алкаголь, у тым ліку піва, квас і газіраваныя напоі; кава і моцны чай (асабліва з араматызатарамі); шакалад.

Язва страўніка і дванаццаціперснай кішкі ў фазе абвастрэння, востры гастрыт, апёк стрававода

Неабходны ложкавы рэжым; ежа невысокай каларыйнасці; абмежаванне вугляводаў да 200 г у дзень; 6-разовае дробнае харчаванне; ежа негарачая і нехалодная.

ДАЗВАЛЯЕЦЦА:

крупы — манныя, аўсяныя, грэцкія на малацэ (грэцкія нават праціраюць праз сіта), тварожныя запяканкі-суфле на пары, без прыпраў кшталту карыцы; мяса — раз у суткі, нятлустае (курыца, трус, ялавічына) перарабіць на фарш і гатаваць на пары, рыба нятлустая белая ў выглядзе фаршу, прыгатаваная на пары;

гародніна — някіслая, у выглядзе пюрэ для дзіцячага харчавання.

ЗАБАРАНЯЕЦЦА:

мяса (карбанат, кансервы мясныя з курыцы, вяндліна, каўбаса языковая; свініна, бараніна, сала), рыба (тлустая — фарэль, ласось), фрукты (любыя неапрацаваныя), кісламалочныя прадукты і сыр (можна пазней), кава, чай, газіроўка; хлеб, цукар, мёд.

Прыклад меню:

Сняданак. 2 яйкі ўсмятку, шклянка малака.

Другі сняданак. Шклянка малочнага кісялю.

Абед. Суп з дазволенай крупы; курынае паравое суфле, гародніна з дзіцячага харчавання або працёртая без прыпраў; фруктовае жэле.

Падвячорак. Шклянка малака, шклянка адвару шыпшыны.

Вячэра. Тварожнае паравое суфле, манная каша.

На ноч. Шклянка малака.

Язвавая хвароба страўніка і дванаццаціперснай кішкі ў стадыі рэмісіі, востры гастрыт у стадыі заціхання

ДАЗВАЛЯЕЦЦА:

нямоцны чай або какава (з малаком ці вяршкамі), хлеб белы ўчарашні, белыя сухары, няздобнае пячэнне; малако, вяршкі, свежая някіслая смятана і сыракваша, нятлусты працёрты тварог, сметанковае масла, рафінаваныя алеі; яйкі (1-2 у дзень) усмятку або як амлет, супы-пюрэ з гародніны (акрамя белакачаннай капусты), суп малочны з вермішэллю; бульба, квацістая капуста, буракі, морква, маладыя кабачкі і гарбузы (як пюрэ), зялёны гарошак (у невялікай колькасці); салодкія спелыя фрукты і ягады (запечаныя, кампоты, сокі, кісялі, мус, жэле, варэнне, адвар шыпшыны); цукар, зефір, пасціла; крупы манныя, грэцкія, аўсяныя, рысавыя (кашы з малаком, маслам), вермішэль або дробныя макароны, нятлустае мяса (ялавічына, цяляціна, трус, курыца, індычка), рыба (катлеты, суфле), закускі (нявостры сыр, нятлустая вяндліна, салаты з адвараній гародніны, мяса, рыбы, варанай каўбасы).

Прыклад меню

Сняданак. Яйка ўсмятку, каша грэцкая, чай з малаком.

Другі сняданак. Тварог свежы някіслы, адвар шыпшыны.

Абед. Суп бульбяны вегетарыянскі, мяса варанае, запечанае пад соусам бешамель, морква адварная, кампот з сухафруктаў.

Падвячорак. Адвар пшанічнага вотруб'я з цукрам і сухарыкі.

Вячэра. Рыба адвараная, запечаная пад малочным соусам, маркоўна-яблычны рулет, чай з малаком.

На ноч. Малако.

Хранічныя захворванні кішэчніка (запоры) пры адсутнасці іншых захворванняў органаў стрававання

Паказана фізіялагічна паўнацэнная дыета, якая ўключае прадукты, багатыя на грубую раслінную клятчатку, што стымулюе перыстальтыку кішэчніка.

ЗАБАРАНЯЕЦЦА:

хлеб з мукі найвышэйшага гатунку, слоенае і здобнае цеста; рыс і манную крупу абмежаваць; тлустае мяса; яйкі ўкрутую і смажаныя; вэнджанае, кансервы; рэдзька, радыска, часнок, цыбуля, рэпа, грыбы; чарнацы, айва, кізіл; шакалад, вырабы з крэмам; жывёльныя і кулінарныя тлушчы; вострыя і тлустыя соусы, хрэн, гарчыца, перац; какава, чорная кава, моцны чай, кісель, алкаголь.

Прыклад меню:

Сняданак. Салата са свежай капусты і морквы са смятанай (150 г), каша прасяная малочная (280 г), кава з малаком (180 г).

Другі сняданак. Свежы яблык.

Абед. Суп з гародніны з алеем (400 г), адвараное мяса (55 г), буракі тушаныя (180 г), жэле фруктовае (130 г).

Падвячорак. Размочаны чарнасліў (50 г).

Вячэра. Галубцы з гародніны з алеем (200 г), крупнік з грэцкай крупы з творагом (200 г), нямоцны чай (180 г).

На ноч. Кефір (180 г).

На ўвесь дзень. Хлеб жытні (150 г), хлеб пшанічны з вотруб'ем (200 г), сметанковае масла (10 г), цукар (40 г).

Вострыя і хранічныя захворванні кішэчніка, якія суправаджаюцца паносамі

Неабходна знізіць калараж ежы за кошт абмежавання тлушчаў і вугляводаў, а колькасць бялкоў павінна адпавядаць фізіялагічнай норме. Трэба пазбягаць хімічных, механічных і тэмпературных раздражняльнікаў, прадуктаў, якія спрыяюць браджэнню ў кішэчніку.

ДАЗВАЛЯЕЦЦА:

сухары і ўчарашні белы хлеб; супы на абястлушчаным мясным або рыбным булёне з дабаўленнем слізістых адвараў круп, варанага мяса, паравых фрыкадэлек; паравыя або звараныя на вадзе катлеты, фарш з адвараным рысам, варанае мяса; звараная на пары ці вадзе нятлустая рыба; вараная працёртая гародніна; рысавая, аўсяная, грэцкая кашы на вадзе; яйкі ўсмятку або амлет; кісялі і жэле з чарніц, кізілу, айвы, груш, працёртыя сырыя яблыкі; цукар абмежаваць; зялёны чай, адвары з шыпшыны, сушаных чарніц, чаромхі, чорнай парэчкі, летам — ягады чарніц (1 шклянка ў тры прыёмы).

Прыклад меню:

Сняданак. Рыбныя паравыя катлеты, каша на вадзе рысавая, працёртая, чай.

Другі сняданак. Несалёны тварог.

Абед. Суп-пюрэ з мяса, фрыкадэлькі мясныя без гарніру, адвар з пладоў чарніц.

Падвячорак. Сухарыкі з пшанічнага хлеба салодкія, адвар чаромхі.

Вячэра. Амлет на пары, каша манная на мясным булёне.

На ноч. Кісель з адвару сушаных пладоў чорнай парэчкі.

На ўвесь дзень. Сухарыкі з пшанічнага хлеба (100 г), цукар (40 г), масла сметанковае (10 г).

■ Рэжым дня

БУДЗЬЦЕ «ЖАЎРУКАМІ»: НА ІХ БАКУ ПРЫРОДА!

Мы часта выкарыстоўваем паняцці «жаўрук» і «сава» для апраўдання сваёй працаздольнасці або ляноты ў пэўныя гадзіны дня. Такімі птушынымі назвамі абазначаюць хранатыпы людзей. Ён звязваецца з пікамі ды спадамі нашай актыўнасці.



Да «жаўрукоў» адносяць тых, чый пік актыўнасці пачынаецца раніцай і доўжыцца да абеду. З надыходам вечара актыўнасць згасае і ноччу такія людзі моцна спяць, каб прачнуцца наступнай раніцай з першым пеўнем. На «соў» бадзёрасць нападае ў другой палове дня. Такія людзі прачынаюцца значна пазней за сонейка, бліжэй да 10-11 гадзін, а часам могуць праспаць і да абеду. Раніцай яны кволыя, стомленыя, аднак бліжэй да 15 гадзін з'яўляецца нармальная працаздольнасць, пік якой прыпадае на той час, калі сонца ўжо садзіцца. Так што апоўначы «совы» могуць спакойна выконваць важную працу.

— Жыццё на планеце, у тым ліку і чалавек, наўпрост залежыць ад сонечнага рытму, — кажа **ўрач-псіхатэрапеўт Мінскага гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Інга СВЯТОШЧЫК.** — Чалавецтва заўсёды ўзаемадзейнічала з сонцам, людзям не дазвалялася позна прачынацца, бо ўсю працу неабходна выканаць цягам светлавога дня. Калі рана ўставаць, шмат працаваць, то і засынаць, вядома, будзеш рана. Сёння ў такім рытме могуць існаваць толькі тыя людзі, якія жывуць хіба ў плямёнах, далей ад цывілізацыі.

Статыстыка сцвярджае, што даволі значная колькасць жыхароў цывілізаваных краін — «совы». А з'яўленню гэтага хранатыпу спрыяла вынаходніцтва электрычнасці. Некалі гэта былі людзі, якія адпачывалі больш, чым працавалі, любілі пагуляць, а такіх звычайна няшмат. Аднак з вынаходніцтвам электрычнасці і дзейнасці, не звязанай з сонечнай актыўнасцю, «соў» істотна пабольшала.

Добра вядома, што схільнасць да хранатыпу не перадаецца генетычна, яна фарміруецца пад уплывам канкрэтных жыццёвых умоў. Кім будзе чалавек — «жаўруком» ці «савою» — залежыць выключна ад яго паводзінаў і ладу жыцця. Хоць больш фізіялагічным, натуральным для любога чалавека з'яўляецца рэжым «жаўрука». Менавіта да яго прыстасаваны нашы асноўныя фізіялагічныя функцыі, напрыклад, тэмпература цела. Ноччу нават у таго, хто напружана працуе, яна зніжаецца, як і ў таго, хто спіць.

Пастаяннае парушэнне рэжыму сну і бадзёрасці ў рэшце прыводзіць да таго, што некаторыя менш устойлівыя фізіялагічныя працэсы пачынаюць перабудоўвацца, прыстасоўвацца да вячэрняга рытму працы. Так, частата пульсу, якая звычайна вышэйшая раніцай, у тых, хто працуе вечарамі, паступова пачынае ўзрастаць у вячэрні час і становіцца нават большай, чым раніцай.

Абсалютная большасць маладых працаздольных людзей — «совы», а грамадскі лад разлічаны менавіта на «жаўрукоў». Бальніцы, школы, дзіцячыя садкі, дзяржустановы, дый усё ў нашым жыцці працуе ў тым рытме, які бліжэй «жаўрукам». Нядзіўна, што асноўнай прычынай сучаснага стрэсу становіцца пастаянны храналагічны збой.

«Жаўрукі», зразумела, знаходзяцца ў больш выйгрышным становішчы. Акрамя таго, яны жывуць у гармоніі з прыродай. Што да «соў», то большасць псіхолагаў лічаць, што такі рытм жыцця не нясе асаблівай пагрозы, тым больш калі гэта ўласны выбар чалавека. Аднак не кожны можа ўладкаваць сваё жыццё так, каб яму было максімальна камфортна.

Часам людзі адносяць сябе да «соў» толькі таму, што не здольны правільна арганізаваць сваю дзейнасць. Ім даводзіцца позна засынаць не ад таго, што яны вядуць лад жыцця «савы», а да гэтага іх «прыстасавалі» асабістыя інтарэсы — прагляд па начах тэлевізара або пасядзелкі за камп'ютарам. Таму «псеўдасовам» цяжка прачынацца раніцай, яны пачынаюць прапускаць заняткі, спазняцца на працу, не могуць сабрацца з сіламі і думкамі да абеду...

Змяніцца не так і цяжка. Спачатку трэба адрэгуляваць асвятленне, паколькі менавіта на святло рэагуюць сістэмы нашага арганізма, разумеючы, ці трэба рыхтаваць арганізм да сну, ці варта ўжо прачынацца. Па-другое, неабходна перанесці выкананне адказнай і напружанай працы з вечара на дзень. Не варта чытаць непасрэдна перад сном. Абавязкова вечарам трэба пагуляць. Займацца фізкультурай і фізічна працаваць трэба толькі днём. Класціся спаць і ўставаць — у адзін і той жа час! Пасля такіх змен вы заўважыце, што працаздольнасць і самаадчуванне істотна палепшыліся.

■ Фактары рызыкі

АТЭРАСКЛЕРОЗ: ТЛУШЧ У САСУДЗЕ

Атэрасклератычныя змяненні ў сасудах выяўляюцца нават у нованароджаных. Аднак найчасцей захворванне сустракаецца ў мужчын пасля 35 гадоў з вялікім узроўнем стрэсу. Атэрасклероз — гэта хранічны стан, пры якім сценкі артэрый ушчыльняюцца і губляюць эластычнасць, што прыводзіць да звужэння іх прасвету, а значыць, абцяжарвае ток крыві. Развіццю гэтага стану спрыяюць і іншыя захворванні — цукровы дыябет, атлусценне, падагра, жоўцекамянёвая хвароба. Даволі вялікае значэнне маюць нізкая фізічная актыўнасць, харчаванне з празмернай колькасцю жывёльнага тлушчу, а таксама псіхаэмацыянальнае перанапружанне, якое траўмуе нервовую сістэму.

— У здаровых людзей кроў свабодна паступае па артэрыях ва ўсе часткі цела і такім чынам забяспечвае кіслародам і пажыўнымі рэчывамі, — тлумачыць **вядучы навуковы супрацоўнік РНПЦ «Кардыялогія» Ігар КАЗЛОЎ**. — Галоўны віноўнік развіцця атэрасклерозу — халестэрын, тлушчападобнае рэчыва. **«Шкодныя» халестэрыны** (іх некалькі — нізкай і вельмі нізкай шчыльнасці), або **ліпіды**, або **тлушчы**, спалучаюцца з бялкамі і ўтвараюць тлушча-бялковыя комплексы — ліпапратэіды. Самым важным у развіцці захворвання з'яўляецца паказчык халестэрыну ліпапратэідаў нізкай шчыльнасці.

У процівагу «шкоднаму» халестэрыну выступае «карысны» халестэрын ліпапратэідаў высокай шчыльнасці. Калі «шкодны» прыцягваецца да сасудзістай сценкі, то «карысны» забірае яго і адводзіць для перапрацоўкі ў печань. Адпаведна, самы непажаданы варыянт — калі спалучаюцца высокі ўзровень «шкоднага» і нізкі «карыснага» халестэрыну.

У людзей без клінічных праяў атэрасклерозу падчас прафілактычнага абследавання вызначаюць толькі агульны халестэрын (паколькі асноўную масу яго складае шкодны, то адной лічбы можа быць дастаткова). Аднак, калі агульны халестэрын павышаны, абавязкова трэба зрабіць аналіз на поўны ліпідны спектр крыві.

Колькасць агульнага халестэрыну ў крыві здаровага чалавека не павінна перавышаць 5,2 ммоль/л. Для здаровых, але з двума фактарамі рызыкі (напрыклад, мужчынскі пол + курэнне або жаночы пол пасля 60 гадоў + спадчыннасць) — складаць не больш за 4 ммоль/л.

Для хворых (стэнакардыя, інфаркт міякарда, кардыясклероз, хваробы сасудаў галаўнога мозга, артэрый ног) — не больш за 3,4 ммоль/л.

Яшчэ адзін тлушч крыві — трыгліцэрыды. Высокі ўзровень трыгліцэрыдаў таксама будзе спрыяць атэрасклерозу, інфаркту і г.д. Колькасць гэтага віду тлушчу крыві павялічваецца пры злоўжыванні алкаголем, цукровым дыябеце, атлусценні, лішку тлустай ежы ў рацыёне. Часам гэта абумоўлена спадчыннасцю. Пры вельмі высокіх узроўнях трыгліцэрыдаў узрастае рызыка трамбозу сасудаў, а пры паказчыку звыш 5,5 ммоль/л павялічваецца верагоднасць вострага запалення падстраўнікавай залозы. Нармальны ўзровень трыгліцэрыдаў у крыві — менш за 1,7 ммоль/л.

— Лішак халестэрыну ў крыві адкладваецца на ўнутранай паверхні сасудаў — гэта і ёсць утварэнне атэрасклератычных бляшак, — кажа Ігар Дзмітрыевіч. — Хуткасць працякання гэтага складанага працэсу залежыць ад многіх фактараў, сярод якіх не толькі ўзровень халестэрыну, але і стан унутранай высцілкі сасуда — эндатэлію. Пры парушэнні яго функцыі або наяўнасці мікразапалення атэрасклероз развіваецца, зразумела, хутчэй. Аднак увогуле працэс гэты павольны, цягам дзесяцігоддзяў ён ахоплівае ўсё новыя сасуды.

Калі ўрэшце прасвет артэрыі звужаецца больш чым напалову, чалавек адчувае першыя непрыемныя сімптомы. Гэта сведчыць аб пачатку развіцця ішэмічнай хваробы сэрца, якая ўключае тры асноўныя формы: стэнакардыю, інфаркт міякарда, хранічную сардэчную недастатковасць. Ішэмія — гэта недахват паступлення кіслароду і крыві да сардэчнай мышцы (міякарда). Міякард галадае, бо не атрымлівае неабходны кісларод і назапашвае таксічныя прадукты абмену рэчываў. Хворы пры гэтым адчувае боль, які нібы апякае сэрца і сціскае горла (стэнакардыя). Можа быць проста адчуванне цяжару, сціскання за грудзінай ці непасрэдна ў вобласці сэрца. Доўжыцца боль можа 2-5 хвілін і суправаджацца задышкай, млосцю, ванітамі, галавакружэннем, пачуццём страху. Прыступ праходзіць праз 1-2 хвіліны пасля ўжывання нітрагліцэрыну. Найбольш такі стан развіваецца ў пажылым узросце, прычым у мужчын у 3-5 разоў часцей. Жаночыя гармоны эстрагены абараняюць жанчын да надыходу клімаксу ад адкладанняў халестэрыну на сценках сасудаў.

На галодным пайку клеткі міякарда могуць пражыць 20-30 хвілін, пасля чаго гінуць — гэта і ёсць інфаркт, вострая сардэчная катастрофа.

Спачатку недастатковае кровазабеспячэнне заяўляе пра сябе толькі пры значнай фізічнай нагрузцы, калі патрэба мышцы сэрца ў пажыўных рэчывах і кіслародзе рэзка ўзрастае. Гэта можа быць хуткая хада, пад'ём угару. У такіх выпадках кажуць пра **стэнакардыю напружання**, якая знікае як толькі знікае нагрузка. Варта зноў пайсці, і боль вяртаецца, таму хворы, здараецца, вымушаны спыняцца праз кожныя 100-200 крокаў. Такія прыступы могуць быць звязаны і з курэннем, ужываннем алкаголю або пераяданнем, даволі рэдка — з хваляваннем.

Захворванне развіваецца, і вось ужо болевыя прыступы заяўляюць пра сябе нават пры поўнай нерухомасці, ноччу, падчас сну. І гэта называецца **стэнакардыяй спакою**. Сімптомы звязаны з далейшым звужэннем просвету каронарных сасудаў, атэрасклератычная бляшка працягвае «расці». Гэта ёсць хранічная ішэмічная хвароба сэрца.

Калі досыць шчыльная абалонка бляшкі разарвецца, то на месцы разрыву ўтворыцца тромб, які часткова ці поўнасцю здольны перакрыць артэрыю. Калі гэта будзе каронарная артэрыя, то частка сэрца, якую яна харчавала, застанецца без крыві і кіслароду. На галодным пайку клеткі міякарда могуць пражыць 20-30 хвілін, пасля чаго гінуць — гэта і ёсць інфаркт, вострая сардэчная катастрофа, участак змярцвення ў тканцы сэрца. На месцы катастрофы застаецца рубец.

Рызыку інфаркту міякарда істотна павялічваюць:

- мужчынскі пол
- для жанчын — узрост пасля 50 гадоў
- спадчыннасць (ішэмічная хвароба сэрца, інфаркт, мазгавы інсульт нават у аднаго прамога сваяка: бацькоў, бабулі, дзядулі, асабліва калі захворванне пачалося да 55 гадоў)
- павышаны халестэрын крыві (звыш 5 ммоль/л)
- курэнне (вельмі істотны фактар рызыкі!)
- лішняя вага і маларухомы лад жыцця
- павышаны артэрыяльны ціск (звыш 140/90 мм рт. сл. у любым узросце)
- цукровы дыябет.

Наяўнасць двух і болей фактараў павялічвае рызыку ў геаметрычнай прагрэсіі.

■ Карысныя плады

Малыя, ды «залатыя»

У мякаці пладоў абляпіхі — шмат вітамінаў, караціноідаў, фітастэролаў, ёсць тлустыя кіслоты, у тым ліку амега-3, неабходная для эфектыўнай работы мозга.

Плады і алей абляпіхі выкарыстоўваюць у народнай медыцыне для лячэння розных захворванняў, зажыўлення ран, аднаўлення тканак і ўмацавання імунітэту. Прэпараты з гэтай ягады могуць быць надта інтэнсіўнымі, таму без згоды доктара іх выкарыстоўваць не рэкамендуецца, а вось як ежа абляпіха і карысная, і бяспечная.

У пладах шыпшыны — вялікая колькасць антыаксідантаў, у тым ліку вітаміну С (лічыцца, што ў гэтым ёй няма роўных), плюс раслінная клятчатка.

Народная медыцына сцвярджае, што шыпшына зніжае артэрыяльны ціск, узровень «дрэннага» халестэрыну, боль у суставах, павышае агульны тонус арганізма, нават спрыяе зніжэнню вагі. Прэпараты з шыпшыны могуць быць таксама інтэнсіўнымі, выклікаць пабочныя эфекты і ўзаемадзейнічаць з некаторымі лекамі, таму прымаць іх трэба пад назіраннем урача. А ў якасці адвараў і джэмаў (лыжка джэму, шклянка адвару) шыпшына бяспечная і карысная. Найчасцей за ўсё з ягадай гатуюць напоі, выпечку, мармелад, джэм, сіроп і віно. Каб «выцягнуць» максімум карысных рэчываў з сухой шыпшыны, яе трэба варыць цягам гадзіны. Пасля можна піць.

Матэрыялы паласы падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА. protas@zviazda.by

«Хвала, хвала табе, баец!»

Па гарызанталі: 3. «А ... Міная — // Героя Шмырова, // Застанецца вечна ў душах людзей». З верша А. Ляха «Бацька Мінай». **8.** «На сцягу тым палала ..., // Блішчэлі росы слёз». З верша П. Броўкі «Балада пра чырвоны сцяг»; 25 чэрвеня — 110 гадоў з дня нараджэння народнага паэта Беларусі. **9.** ... Галавачоў. Імя лётчыка-аса, двойчы Героя Савецкага Саюза, генерал-маёра, ураджэнца Буда-Кашалёўскага раёна Гомельскай вобласці, які за час Вялікай Айчыннай вайны здзейсніў 457 баявых вылетаў. **10.** Рашучы, імклівы рух войск на праціўніка. **13.** Сродак, зброя (перан.). **15.** У германа-скандынаўскай міфалогіі — дух прыроды. **16.** «Як у лузе, каля рэчкі. // Нізка сцелецца туман. // Па ўсім Саюзе ходзіць //... нашых партызан». Прыпеўка. **18.** Народнае эпічнае апавяданне пра герояў Вялікай Айчыннай вайны. **19.** Стрыжань, які перадае рух ад адной часткі механізма да другой. **21.** Духоўны кіраўнік у мусульман. **22.** Не пахмурна, а .... **23.** «На ўсе лады паэмы і быліны//Пяюць: ..., ... табе, баец!» З верша П. Панчанкі «Франтавік». **25.** Народ і армія — ... сям'я (прык.). **27.** «Закіпела гневам, злобай // Беларуская зямля, // Паднялась магутным шквалам // Партызанская ...». З «Песні партызан» (словы і музыка народныя). **29.** «Помнім мы болі і страты свае, //... шуміць, як чароты. // О, як нам вас нестае, — // Кожны чацвёрты!». З верша А. Вярцінскага «Рэквіем па кожным чацвёртым». **31.** «... страляюць ва ўпор». Раман І. Новікава пра мінскае падполле. **32.** Сістэма знакаў для сакрэтнага пісьма. **33.** Горад на Міншчыне, малая радзіма двух родных братоў — Герояў Савецкага Саюза Яўсея і Мацвея Вайнрубаў.

Па вертыкалі: 1. Іван .... Прозвішча двойчы Героя Савецкага Саюза, маршала Савецкага Саюза, ураджэнца Горацкага раёна: яго імем названы вуліца ў г. Мінску і Кіеўскае вышэйшае танкавае вучылішча. **2.** «Як мы жылі, хадзілі ў ..., // За маці-Беларусь». З «Песні беларускіх партызан» (сл. П. Броўкі, муз. І. Любана). **4.** Гатунак дробных цукерак. **5.** ... Гусакоўскі. Імя двойчы Героя Савецкага Саюза, гвардыі палкоўніка, пасля вайны — генерала арміі бранятанкавых войскаў, ураджэнца Крычаўскага раёна. **6.** ... салдаты — не войска, ... дубы — не дуброва (прык.). **7.** Гарадскі пасёлак у Бабруйскім раёне, малая радзіма двойчы Героя Савецкага Саюза Сцяпана Шутава, палкоўніка, камандзіра танкавай брыгады; яго імя носяць вуліцы ў Маскве і Кіеве. **11.** «Сёння Купалка, а заўтра ..., // Пойдзем, дзявочкі, у квяточкі». З купальскай песні. **12.** Рабочая і вучэбная карабельная шлюпка. **14.** «..., ... // Адна ў Марата // І маці-Радзіма // У Марата адна». З кантаты «Памяці Марата Казея» (сл. А. Вольскага, муз. Ул. Алоўнікава). **17.** ... Антоненка. Імя лётчыка-знішчальніка, ураджэнца Слаўгарадскага раёна, які першы сярод ураджэнцаў Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну быў узнагароджаны высокім званнем Героя Савецкага Саюза; загінуў у ліпені 1941 года. **20.** Спецыяльныя прыборы. **23.** «Неба ўсё пакрылі ..., // Падымаецца туман. // Сабіраюцца атрады // Беларускіх партызан». Прыпеўка. **24.** Шостая нота музычнай гамы. **25.** Імклівы напад войскаў на праціўніка. **26.** Цвёрдая набойка на падэшве пад пятой. **27.** Часціца ўказальная: ужываецца для ўзмацнення эмацыянальнай афарбоўкі сказа. 28. Добрым людзям — ..., а шаленцам — галавою ў вір (прык.). **30.** «Канстанцін Заслонаў — наша слава, // Беларусі — партызанскі ...». З «Песні пра Заслонава» (сл. А. Астрэйкі, муз. Ул. Алоўнікава).

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ. *г. Дзяржынск.*



Па гарызанталі: 3. Полацкі. **8.** Кроў. **9.** Павел. **10.** Ларга. **21.** Імам. **22.** Ясна. **23.** Хвала. **25.** Арда. **27.** Вай-на. **29.** Памяць. **31.** Рэйні. **32.** Шыфр. **33.** Барысаў.

Па вертыкалі: 1. Якубоўскі. **2.** Бой. **4.** Драже. **5.** Іосіф. **6.** Два. **7.** Гушча. **11.** Ян. **12.** Ял. **14.** Граната. **17.** Аляксей. **20.** Апаратура. **23.** Хмары. **24.** Ля. **25.** Атака. **26.** Абдас. **27.** Во. **28.** Мір. **30.** Сын.

■ І мы там былі

На берагах венецыянскіх каналаў — будучыня ўсяго свету

Найбуйнейшы мастацкі форум у свеце — Венецыянская біенале — бярэ свой пачатак аж з 1895 года. З таго часу шмат вады змянілася ў легендарнай лагуне, ды і сусветнае мастацтва сёння мала чым нагадвае колішні акадэмізм ці мадэрн.

У першыя майскія дні ў Венецыі распачалася 56-я па ліку прэзентацыя шматлікіх мастацкіх навінак з большасці краін свету, якая працягнецца да кастрычніка. Відавочнага лідарства сёлета тут няма. Мова еўрапейскага мастацтва мала чым адрозніваецца ад творчых эксперыментаў краін Азіі ды Афрыкі. Нацыянальныя экспазіцыі размешчаны па розных выставачных памяшканнях у былым арсенале, пакгаўзах, паркавых павільёнах... Каб ахапіць позіркам усе творчыя навацыі, неабходна вызначыць для сябе сапраўдны доследны маршрут, прыхапіць з сабой даведнікі ды буклеты і вандраваць пешкі і на водна-аўтамабільным транспарце не адзін кіламетр. Але такія намаганні сябе апраўдваюць.

Венецыя. Падчас біенале тут асабліва шматлюдна.

«Дзве архідэі» Ізы Генцкен.

Становіцца відавочным, што «Будучыня ўсяго свету» (так гучыць дэвіз сёлетняй экспазіцыі — All the world's futures) не можа існаваць без вобразных спадзяванняў і ўяўленняў мастакоў-наватараў розных краін.

Сродкі выразнасці ў сучасным мастацтве павінны рэагаваць на праявы сучаснага жыцця не толькі аператыўна, але і... парадаксальна, таму ў кожным павільёне гледачоў чакае нешта непрадбачанае і не заўсёды лёгкае для разумення. Паўсюль шмат відэаінсталяцый, фотаэкспазіцый, мудрагелістых нефункцыянальных канструкцый з металу і сілікону. І не хапае звыклага для беларускіх аматараў мастацтва жывапісу...

У самім беларускім павільёне экспануюцца на віртуальным экране архіўныя фотаматэрыялы, прысвечаныя ваеннай гісторыі, падрыхтаваныя вядомым скульптарам Канстанцінам Селіханавым. Ваенная праблематыка прысутнічае і ва ўкраінскіх экспазіцыянераў. У іншых мастацкіх павільёнах больш актуалізавана ідэя інтэграцыі, вяртання да вытокаў цывілізацый. Напрыклад, італьянскія мастакі стварылі выставачны тандэм з творцамі Лацінскай Амерыкі, дзе дамінуюць першабытныя татэмічныя адлюстраванні, а амерыканскія аўтары паспрабавалі прыгадаць традыцыі фотарэалістычнага жывапісу 1970-х гг.

Своеасаблівымі дамінантамі гэтага форуму творчых ідэй сталі буйнамаштабныя кампазіцыі з металу «Дзве архідэі» Ізы Генцкен (Германія) і «Феніксы» Сю Бінга (КНР). Падобна, у наш час будучыня бачыцца... праз прызму звароту да міфалагічных архетыпаў, набліжэння да прыродных формаў. У гэтым сэнсе нашым айчынным мастакам ёсць што ўзяць са скарбонкі нацыянальных традыцый. У тым ліку і жаданне ініцыяваць правядзенне міжнародных творчых форумаў у сябе на радзіме, якая зараз у свеце набывае прызнанне як цэнтр мірных пагадненняў і талерантнасці.

Тамара ФАМЕНКА. Фота аўтара.

Венецыя — Мінск.

ГАРАСКОП СТРЫЖАК НА ЛІПЕНЬ

4 ліпеня, *субота.* На календары неспрыяльны дзень для стрыжкі валасоў.

5 ліпеня, *нядзеля.* Яшчэ адзін неспрыяльны дзень — стрыжка можа парушыць энергетычны баланс, а таксама справакаваць праблемы са здароўем, істотны заняпад сіл і дэпрэсію.

6 ліпеня, *панядзелак.* Сёння не дзень для наведвання цырульніка — стрыжка негатыўна адаб'ецца на структуры валасоў і на вашай уласнай самаацэнцы.

7 ліпеня, *аўторак.* Неспрыяльны час для стрыжкі і афарбоўвання валасоў.

8 ліпеня, *серада.* Неспрыяльны дзень для стрыжкі валасоў, але добры для правядзення эпіляцыі.

9 ліпеня, *чацвер.* Сёння неспрыяльны дзень для стрыжкі валасоў.

10 ліпеня, *пятніца.* Афарбуйце сёння валасы ў свой натуральны колер — гэтым вы прыцягне да сябе «патрэбных» людзей.

11 ліпеня, *субота.* Зробленая сёння прычоска здольная ўзмацніць харызму яе ўладальніка, актывізуе яго асабістую энергетыку, напоўніць лёгкія дабратворным паветрам, а душу аптымізмам і верай ва ўласную ўдачу.

12 ліпеня, *нядзеля.* Стрыжка будзе ўдалай, асабліва захапляльным атрымаецца вобраз з лёгкай і паветранай прычоскай.

13 ліпеня, *панядзелак.* У гэты дзень добра рабіць лёгкія паветраныя прычоскі. Стрыжка ніяк не паўплывае на стан валасоў.

14 ліпеня, *аўторак.* Пасля стрыжкі ў дні Рака прычоска абсалютна не трымае форму, валасы становяцца непаслухмянымі, не паддаюцца ўкладцы.

15 ліпеня, *серада.* Устрымайцеся ад стрыжкі, могуць здарыцца непрыемнасці са здароўем.

16 ліпеня, *чацвер.* Выдатны дзень для стрыжкі і афарбоўвання валасоў. Маладзік — гэта той дзень, калі задуманыя жаданні спраўджваюцца. Можна памарыць, каб вашы валасы былі заўсёды прыгожымі.

17 ліпеня, *пятніца.* Выдатны дзень для наведвання цырульніцкага салона. Фарба для валасоў ляжа роўна, яе колер доўга не паблякне, а стрыжка зробіць вас больш рашучымі.

18 ліпеня, *субота.* Спрыяльны дзень для наведвання салона. У гэты перыяд паляпшаецца структура і паскараецца рост валасоў.

19 ліпеня, *нядзеля.* Дзень цудоўна падыходзіць для наведвання цырульніка.

20 ліпеня, *панядзелак.* Добры дзень для стрыжкі, яна ў такія дні робіць валасы прыгожымі, пышнымі і шаўкавістымі.

21 ліпеня, *аўторак.* Дзень выдатна падыходзіць для стрыжкі, больш за тое, стрыжка дапаможа прыцягнуць у жыццё каханне, новыя перспектыўныя знаёмствы і яркія ўражанні.

22 ліпеня, *серада.* Пасля стрыжкі ў гэты дзень валасы растуць даволі хутка, але іх якасць і структура не мяняюцца.

23 ліпеня, *чацвер.* Сёння сатанінскія 9 месяцовыя суткі, стрыгчы валасы і афарбоўваць іх не рэкамендуецца.

24 ліпеня, *пятніца.* Па тыбецкіх традыцыях гэта дзень, які спальвае. Рэкамендуецца ўстрымацца ад стрыжкі, бо гэта прыцягне да вас хваробы.

25 ліпеня, *субота.* Вельмі непажаданы дзень для стрыжкі, вас замучаюць недахопы ўласнай натуры. Пастаянна будзе здавацца, што вы недасканалыя, што будзе вельмі цяжка дасягнуць чагосьці такога, што магло б дапамагчы прасунуцца наперад.

26 ліпеня, *нядзеля.* У выніку стрыжкі валасоў узрасце прывабнасць, вы будзеце падабацца людзям.

27 ліпеня, *панядзелак.* Стрыжка валасоў прынясе шчасце і ўпэўненасць у сабе.

28 ліпеня, *аўторак.* Добра стрыгчы валасы тым, у каго аслабленае фізічнае здароўе і каму надакучыла манатоннасць у жыцці, каму не хапае актыўнасці, смеласці і валявых якасцяў.

29 ліпеня, *серада.* Спрыяльны дзень для стрыжкі і афарбоўвання валасоў. Стрыжка прыцягне шчасце, палепшыць знешні выгляд.

30 ліпеня, *чацвер.* Спрыяльны дзень для візіту ў салон. Аднак пры гэтым не варта эксперыментаваць і рэзка мяняць звыклы для вас вобраз.

31 ліпеня, *пятніца.* Калі ў гэты дзень састрыгчы канцы валасоў, то тым самым можна зняць лішні груз, непатрэбную інфармацыю. Валасы ажывуць, амалодзяцца, стануць густейшымі, будуць менш выпадаць.

НА СЛУЖБЕ Ў АЙЧЫНЫ

У Саюзе пісьменнікаў Беларусі падведзены вынікі рэспубліканскага конкурсу на найлепшы твор, які праводзіўся адразу да двух юбілеяў — 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 70-годдзя Вялікай Перамогі. Днямі адбылося ўзнагароджванне пераможцаў.

Дыпломы і самыя розныя адзнакі атрымалі лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Алесь Савіцкі, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Уладзімір Гніламёдаў, доктар філалагічных навук Іван Саверчанка, паэты, празаікі, публіцысты Галіна Нічыпаровіч, Тамара Краснова-Гусачэнка, Алесь Марціновіч, Мікалай Смірноў, Яўген Кашукоў, ды шмат хто яшчэ. Узнагароджванне праходзіла ў мемарыяльнай зале Дома літаратара, дзе наведвальнікаў, удзельнікаў любой сустрэчы сустракаюць фатаграфічныя выявы франтавікоў, партызан і падпольшчыкаў з шэрагаў пісьменнікаў Беларусі. Менавіта ў гэтай зале Саюз пісьменнікаў ладзіць урокі мужнасці, запрашае сюды для размовы літаратурную моладзь.

Уручаючы дыпломы і памятныя падарункі, старшыня СП Беларусі Мікалай Чаргінец выказаў словы падзякі музейным і бібліятэчным работнікам, якія шмат зрабілі і працягваюць рабіць для прапаганды гераіка-патрыятычнай тэмы ў беларускай літаратуры.

Сяргей ШЫЧКО.

Даты Падзеі Людзі

4 ЛІПЕНЯ



1790 год — нарадзіўся Джордж Эверэст, брытанскі геадэзіст. Выканаў тапаграфічную здымку тэрыторыі Індыі і першым вызначыў самай высокай вяршыні свету — Джамалунгмы, якая і была названа Эверэстам.

1810 год — у Магілёўскай губерні нарадзіўся Дзмітрый Пятровіч Жураўскі, эканаміст, статыстык. З 1831 года працаваў у камісіі М. Сперанскага па складанні збору законаў Расійскай імперыі. У пытаннях палітэканоміі набліжаўся да паняцця тэорыі працоўнага і прыбавачнага кошту. Прычыну ўсіх бедаў народа бачыў у існуючых вытворчых адносінах, у размеркаванні прыватнай уласнасці па класах, адкуль вынікала, што галоўным тормазам развіцця прадукцыйных сіл Расіі з'яўляецца прыгоннае права. Прагрэсіўныя палітэканамічныя ідэі Жураўскага абумовілі правільны метадалагічны падыход да статыстычных даследаванняў, а яго працы аказалі вялікі ўплыў на ўсё далейшае развіццё эканамічнай навукі ў Расіі.

1920 год — у ходзе савецка-польскай вайны пачалася ліпеньская аперацыя войскаў Заходняга фронту, у выніку якой да 1 жніўня ад польскіх войскаў была вызвалена амаль уся тэрыторыя Беларусі.

Было сказана

Андрэй ВОЛЯН, палітычны дзеяч, філосаф, ідэолаг Рэфармацыі:

«Нікчэмны той, хто бачыць, як нехта чужы дае яго жонцы тое, чаго не даў ён сам».

Азбука народнай культуры

ад Янкі Крука і Аксаны Катовіч

ГАРОХ. Калісьці гэтая культура з'яўлялася адной з галоўных страў усходніх славян. Сімволіка пладаноснасці і ўраджайнасці гароху дае магчымасць зразумець, чаму славяне вельмі часта выкарыстоўвалі яго ў сямейных абрадах. У песнях гарох звалі золатам. У казках гарохавая сцябліна расце да неба, а тых, хто здолее па ёй узлезці, чакае незлічонае багацце. Цара гэтага царства звалі Гарохавым.

◈ У шматлікіх народных песнях, тлумачэннях сноў гарох атаясамліваецца са слёзамі. Менавіта таму рассыпаны гарох прадказваў бяду і няшчасце.

◈ Для забеспячэння дабрабыту і багацця на працягу новага года ў славян гарох быў абавязковай ежай на Каляды. У гэтыя святочныя дні ў хлеб запякалі некалькі гарошын. Лічылася, каму трапіць луста хлеба з гарохам, той будзе шчаслівым і багатым увесь год.

◈ На Каляды гарохам «закармлівалі» курэй, лічылася, што птушка знясе столькі яек, колькі гарошын з'есць у гэты час; гарохам абсыпалі вуллі і сад, каб забяспечыць пладаноснасць і ўраджай.

◈ Каб увесь год быць з грашыма, трэба было перад калядным вячэрай кінуць лыжку недаваранага гароху ў кут. У некаторых рэгіёнах з гэтай мэтай гарох закопвалі ў зямлю там, дзе з даху капае вада, г.зн. з паўднёвага боку.

◈ У свята, прысвечанае татэмнай жывёле — мядзведзю, варылі гарох і рабілі з яго «камы». Гэты дзень атрымаў назву Камаедзіца (6 красавіка).

◈ Пасля вянчання нявесту абсыпалі гарохам. А па колькасці гарошын, якія застануцца ў адзенні, прадказвалі колькасць будучых дзяцей.

◈ Вянок з гарохавай саломы сімвалізаваў страчаную цнатлівасць, цяжарнасць па-за шлюбам.

◈ Тым кавалерам, якім дзяўчаты адмовілі, вешалі на дзверы ці на воз вянок з гарохавай саломы.

◈ Гарох прысутнічае і ў пахавальнай абраднасці. На Раство гаспадар раскідваў гарох для душ памерлых, глядзеў у бок могілак і клікаў бацькоў на пачастунак. Для палягчэння агоніі пад галаву чалавеку, які канае, клалі гарохавую салому. Часам куццю на жалобны стол рыхтавалі з гароху.

◈ Прыкмячалі: «Калі алешына ў час цвету дае шмат каташкоў, то будзе шмат гароху».

Мікалая ЛІТВІНАВА

віншуем з нараджэннем сына!

Зычым новаму грамадзяніну Беларусі, які з'явіўся на свет у такое вялікае свята, заўсёды крочыць па жыцці пераможцам, а яго бацькам — здароўя, кахання і дабрабыту!

Звяздоўцы.

Утерянный студенческий билет № 6159 УО «БГАИ» на имя ЛЕОНКОВОЙ Юлии Олеговны **считать недействительным.**

06 августа 2015 г. в 15.30 по адресу: ул. Промышленная, 11 состоится общее собрание акционеров ЗАО «СМУ-77».

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	4.44	21.43	16.59
Віцебск	4.25	21.41	17.16
Магілёў	4.34	21.34	17.00
Гомель	4.40	21.27	16.41
Гродна	5.01	21.57	16.56
Брэст	5.11	21.48	16.37

Месяц

Поўня 2 ліпеня.
Месяц у сузор'і Вадалея.

Імяніны

Пр. *Георгія, Максіма, Паўла, Юльяна.*
К. *Альжбеты, Андрэя.*

Фота Алены ДАРАШКЕВІЧ.

ЗАЎТРА



...у суседзяў

ВАРШАВА	+30..+32°С	КІЕЎ	+27..+29°С	РЫГА	+24..+26°С
ВІЛЬНЮС	+27..+28°С	МАСКВА	+24..+26°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	+17..+19°С

УСМІХНЕМСЯ

У вёсцы бацькі заўсёды ведаюць, у колькі прыйшла дадому дачка, таму што на трактары ціха да хаты не пад'едзеш.

Я прагаладаўся і адкрыў піва. Гатаваць не так ужо і складана, не ведаю, чаго там бабы скардзяцца.

Сустракаюцца два прадпрымальнікі.

— Як справы? Як бізнес?

— Што табе сказаць? Не так добра, як мне б хацелася, але і не так ужо дрэнна, як хацелася б табе.

Пайшоў пяты год. Жонка і сёння думае, што гэта кот цягне брудныя шкарпэткі пад канапу.

Спёка ў заапарку

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.092. Індэкс 63850. Зак. № 2521.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 3 ліпеня 2015 года.